КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ №39 (167)
◂ 23 КАСТРЫЧНІКА ◂ 2009 г.

# Новы Час




**РЭЙТЫНГІ СМЕШНЫЯ І НЕ ВЕЛЬМІ**

Стар. 4

**ЯРАСЛАЎ ГРЫШЧЭНЯ: НЕЛЬГА ЗМАГАЦЦА З СІСТЭМАЙ ЛОЗУНГАМІ**

На 1 чэрвеня 2009 года праваабаронцы зафіксавалі 17 выпадкаў прымянення артыкула 193.1.

Стар. 5

**ВАЙНА КАМПРАМАТАЎ**

Афіцыйны старт прэзідэнцкай выбарчай кампаніі ва Украіне адбыўся сінхронна з пачаткам самага гучнага сексуальнага скандалу

Стар. 13

**НА ДНЕ ПАТОПУ**

Стар. 14

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

## Алег Трусаў

Нарыс Аляксандра Тамковіча з цыклу «Трэці сектар у асобах»

▸ **КРЫЗІС**

# ПАД ЗАВЯЗКУ І БЕЗ АГЛЯДКІ

Вольга ХВОІН

**Абнародаваная службовая запіска кіраўніка Нацыянальнага банка Пятра Пракаповіча прэм'еру Сяргею Сідорскаму, у якой стан айчыннай банкаўскай сістэмы характарызаваўся зусім не так, як у афіцыйных заявах, паказала, што абяцанага напрыканцы лета восеньскага пад'ёму эканомікі і блізка не назіраецца.**



http://gdb.rferl.org

У запісцы Пракопавіч адзначыў, што над банкаўскай сістэмай Беларусі навісла «значная пагроза», у сувязі з нарастаючым крызісам ліквіднасці ў дзяржбанках і ростам праблемных крэдытаў павялічыліся затрымкі падатковых выплат. І хаця ў інфармацыйнай службе Нацбанка заявілі, што факты, прыведзеныя ў запісцы, — «у натуральных межах», падстаў для аптымістычных прагнозаў пакуль няма.

Аб'ём праблемных актываў банкаў з пачатку года вырас у 2,5 разы і на 1 верасня склаў 2146 мільярдаў рублёў. Пры гэтым толькі за жнівень праблемныя активы павялічыліся на 14,5 працэнта. А доля праблемных актываў банкаў у актывах, схільных да крэдытнай рызыкі, на 1 верасня склала 3,34 працэнта супраць 1,68 працэнта на 1 студзеня бягучага года.

У звязку з банкаўскай тэматыкай варта ўзгадаць і інфармацыю аб прыпыненні ААТ «АСБ Беларусбанк» выдачы льготных крэдытаў на жыллёвае будаўніцтва. Прычынай стаў той факт, што банк выдаў больш крэдытаў, чым было запланавана пастановай Саўміна. Прэс-служба «Беларусбанка» паведаміла, што да 25 кастрычніка будзе прапрацоўвацца пытанне пра тое, як зноў прыступіць да выплат. На гэтым тыдні стала вядома, што «Беларусбанк» аднавіў выдачу крэдытаў і аплату крэдытных траншаў.

Тыя, хто дачакаўся сваёй чаргі на будаўніцтва, могуць узрадавацца вырашэнню сітуацыі, аднак для патэнцыйных пазычальнікаў факт прыпынення крэдытавання можа быць прадвеснікам таго, што ў перспектыве грошай на жыллё можна і не атрымаць. Дарэчы, прыбытак ААТ «АСБ Беларусбанк» у трэцім квартале 2009 года скараціўся ў 18,6 разы ў параўнанні з папярэднім кварталам: банк атрымаў 3,8 мільярда рублёў прыбытку супраць 70,7 мільярда рублёў у другім і 74 мільярда рублёў у першым квартале.

І хаця жыллёвае пытанне для беларусаў у спісе прыярытэтных, штодзённыя выдаткі прыходзяцца на спажывецкія тавары. Пры гэтым маладыя людзі аддаюць перавагу імпартным прадуктам. Тым больш, што ў змаганні з фінансава-эканамічным крызісам нашы заходнія суседзі актыўна практыкуюць такі інструмент стымуляцыі попыту, як зніжкі і прамоўцыі. Важна адзначыць, што ў іх не назіраецца росту коштаў на фоне падзення нацыянальнай валюты ў адносінах да еўра і долара. Чаго не скажаш пра палітыку айчынных гандлёвых сетак. У выніку лозунг «купляйце беларускае!» спрацоўвае хіба што на абмежаваную колькасць тавараў, напрыклад, прадукты харчавання. Страціўшы экспартныя рынкі, айчынныя вытворцы фактычна нічога не робяць для пашырэння рынку айчыннага.

Нядаўна ў адным з інтэрнэтабмеркаваннняў прадукцыі беларускага легпраму прагучала: «Я такога брэнда не ведаю». Фактычна гэтымі словамі абазначаныя ўсе праблемы нашых вытворцаў: ад якасці тавару да яго пазіцыянавання на рынку. У выніку пры нагодзе беларусы апустошваюць крамы бюджэтных (ва ўмовах скарачэння заробкаў — надзвычай важны аргумент) еўрапейскіх брэндаў ці, не зважаючы на якасць, абіраюць эканом-варыянт кштaлту мясцовага ці украінскага Хмяльніцкага рынку.

Пра крызіс айчыннай гандлёвай сістэмы гавораць забітыя таварамі залі сталічных універмагаў, па якіх звычайна праходжваецца з дзесятак пакупнікоў, ды дадзеныя Нацыянальнага статыстычнага камітэта. На 1 кастрычніка на складах прадпрыемстваў знаходзілася прадукцыі на суму 6159,4 мільярда рублёў, што складае 77,8 працэнта да сярэднемесячнага аб'ёму вытворчасці. Найбольшыя запасы накапіліся ў лёгкай прамысловасці (суадносіны запасаў да сярэднемесячнай вытворчасці 188,1 працэнта), машынабудаванні і металаапрацоўцы (161,1 працэнта).

На фоне тэндэнцыі да пагаршэння сітуацыі ў нацыянальнай эканоміцы ў праекце ўказу кіраўніка дзяржавы «Аб зацвярджэнні важнейшых параметраў прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2010 год» урад робіць аптымістычны прагноз павялічэння экспарту на 29–30 працэнтаў у параўнанні з бягучым годам. То бок праз пару месяцаў Беларусь мусіць пачаць імкліва выходзіць з рэцэсіі.

З гэтым не згодны былы старшыня Нацбанка прафесар Станіслаў Багданкевіч. Эксперт лічыць, што фінансава-эканамічны крызіс, які на Захадзе дасягнуў свайго дна, у Беларусі толькі пераходзіць у больш адкрытую фазу. Паводле меркавання эканаміста, дагэтуль у Беларусі пры дапамозе пазык, якія траціліся на бягучае спажыванне, крызіс быў шмат у чым завуаляваны: «Памер толькі знешніх пазык набліжаецца да велічыні ў 20 мільярдаў долараў. Прырост запазычанасці ў 2009 годзе склаў амаль трацінy. Унутраныя пазыкі эканомікі перад банкамі дасягнулі на пачатак кастрычніка 2009 года ў пераліччэнні на долары 23 мільярдаў, павялічыўшыся з пачатку года больш чым на 5 мільярдаў, або 22,5 працэнты». Усё гэта адбывалася і адбываецца ва ўмовах паніжэння ВУП. «Гэта значыць, запазычанні не зрабілі нашу эканоміку больш прадуктыўнай, канкурэнтаздольнай, а толькі дазволілі падтрымліваць некаторы сацыяльны статус-кво», — рэзюмуе Станіслаў Багданкевіч.

## НАВІНЫ РЭГІЁНАЎ

### ГЛУШКАВІЧЫ. ПАЛЕССЕ ЯК ЁСЦЬ

У мясцовым Палацы культуры адбылося адкрыццё музея сялянскага побыту. Ініцыятарамі яго стварэння выступілі работнікі культуры і адукацыі пры актыўным удзеле аматара мясцовага фальклору Таццяны Красюк. Стварэнне музея — супольная праца многіх калектываў і асобаў. Да аздобы інтэр'еру прычыніўся мастак Іван Бялоцкі, які надаў яму асаблівы каларыт і арыгінальнасць. Экспанаты — звычайныя сялянскія рэчы далёкіх часоў, якія зараз рэдка сустракаюцца на Палессі. Падчас адкрыцця музея навучэнцы мясцовай сярэдняй школы паказалі наведвальнікам абрад «Улазіны».

### ПОЛАЦК. ДРЭВА ЯДНАННЯ СЭРЦАЎ

Пакуль полацкія камунальнікі думаюць, чым бы замяніць традыцыю маладых вешаць на Чырвоны мост сімвалічныя «замочкі кахання», у Фарынава для гэтых мэтаў «вырасла» дзіўнае дрэва. Як распавядае старшыня сельсавета Віктар Чэх, на падобную ідэю яго натхнілі матэрыялы ў прэсе пра традыцыі маладых. Рэалізаваць яе атрымалася пры спонсарскай дапамозе мясцовай прыватнай фірмы «Олдзі-трэйд». Само па сабе «Дрэва кахання» — невялікая металічная канструкцыя з васьмю галінамі, якія ўтвараюць эліпс. У далейшым гэтыя галіны ўпрыгожацца сімвалічным лісцем-замочкамі, а для таго, каб назаўжды «страціць» ключ ад замка, сімвалізуючага яднанне сэрцаў, да паслуг маладых невялікая сажалка, размешчаная побач. Можна чакаць, што праз пару гадоў гэта дзіўнае дрэва распусціцца металічным лісцем, бо на тэрыторыі сельсавета пражывае больш 500 маладых людзей ва ўзросце да 18 гадоў, а ў год адбываецца каля 25 вяселляў. Стаць пачынальнікамі традыцыі выпала Аляксею і Марыне Івановым, шлюб якіх быў зарэгістраваны 17 кастрычніка.

### НАВАПОЛАЦК. ТВОРЧЫЯ СУСТРЭЧЫ

21 кастрычніка суполка «Рубон» Наваполацкай гарадской арганізацыі Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны і бібліятэка імя Я. Коласа ў Наваполацку зладзілі творчую сустрэчу з вядомым беларускім бардам, пераможцам бардаўскіх конкурсаў Таццянай Беланогай. Сустрэча адбылася ў межах кампаніі «Будзьма» і прайшла пры перапоўненай гледачамі зале.

### БРЭСТ. ЗМАГАННЕ З ЖКГ ПРАЦЯГВАЕЦЦА

Абласная кааліцыя АДС працягвае кампанію «За наш горад». Некалькі месяцаў таму кааліцыя звярнулася са скаргай да мясцовых камунальнікаў з нагоды незадавальняючага стану дваравых тэрыторый. Урэшце быў атрыманы адказ, да яго прыкладзена фотасправаздача на 11 старонках, дзе было засведчана, што рамонт адбыўся на тэрыторыі чатырох дамоў па вуліцы Валгаградскай. Аднак у іншых месцах горада работы па навядзенні парадку не праводзіліся. А паколькі ЖКГ парушыла тэрміны адказу на скаргі грамадзян, то адпаведныя заявы былі накіраваны ў пракуратуру.

### СЛУЦК. ЗБРОЙНАМУ ЧЫНУ ПРЫСВЯЧАЕЦЦА

Грамадзянская кампанія «Наш Дом» зладзіла спецыяльны семінар, прысвечаны 90-м угодкам Слуцкага збройнага чыну. З грунтоўным дакладам па гэтай тэме выступіла кандыдат гістарычных навук Ніна Стужынская, якая сярод іншага распавяла пра малавядомыя эпізоды змагання тутэйшых людзей супраць бальшавіцкай акупацыі краю.

ПАМЯЦІ КАЛЕГ

# ЧОРНЫ ДЗЕНЬ БЕЛАРУСКАЙ ЖУРНАЛІСТЫКІ

Генадзь КЕСНЕР

**20 кастрычніка на Каладзішчанскі могілках, што ў 9 кіламетрах на паўночны ўсход ад Мінска, пахавалі вядомага беларускага журналіста Альгерда Невяроўскага. У гэты ж дзень на гэтых жа могілках блізкія і калегі ўсклалі кветкі да магілы Веранікі Чаркасавай — слыннай беларускай журналісткі, жорстка забітай у сваёй сталічнай кватэры роўна пяць гадоў таму.**


Фота Юрыя Дзядзінкіна

Развітацца з Альгердам Невяроўскім прыйшлі дзесяткі людзей. Напярэдадні з Варшавы прывезлі урну з попелам журналіста, крэміраванага ў польскай сталіцы некалькі дзён таму. Да дому на сталічнай вуліцы Каліноўскага, дзе жыў Альгерд Невяроўскі, прыехалі яго калегі з калектываў, дзе журналіст працаваў цягам свайго нядоўгага жыцця, — забароненай уладамі газеты «Свобода», «Радыё Свобода», «Радыё Рацыя».

«Кожнае развітанне з калегамі — гэта яшчэ і знак нам, жывым, больш берагчы адзін аднаго, цаніць творчасць і не шкадаваць добрых словаў пры жыцці», — сказала над магілаю Альгерда старшыня ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў» Жанна Літвіна.

Пасля пахавання Альгерда многія скіраваліся да магілы Веранікі Чаркасавай. Так атрымалася, што менавіта ў дзень пахаванняў Альгерда споўнілася пяць год ад дня жорсткага забойства таленавітай і вядомай журналісткі. «За гэтыя пяць год мы не змаглі даведацца праўды, што здарылася з Веранікай, хто быў яе забойцам, — сказаў рэдактар «Салідарнасці» (у мінулым газеты, дзе працавала Вераніка, а зараз папулярнага аднайменнага інтэрнэт-выдання) Аляксандр Старыкевіч. — Але ёсць і станоўчае, і яно ў тым, што мы помнім Вераніку, штогод прыязджаем на яе магілу. Мы ў нашым калектыве і сёння ставімся да Веранікі як да жывога чалавека, а не як да нябожчыка».

Светлая памяць вам, калегі.

ФОРУМ

# ГРОДЗЕНСКІЯ ПЕРАШКОДЫ

Алесь ЗАРЭМБЮК

**Выканкамы Гродзенскай вобласці забаранілі праводзіць сходы па вылучэнню дэлегатаў на Беларускі еўрапейскі форум.**

У Бярозаўцы, Слоніме, Ваўкавыску, Зэльве, Шчучыне і Мастах актывісты праваабарончага грамадскага аб'яднання «Рух «За Свабоду» мелі намер адкрыта і афіцыйна правесці сходы па вылучэнню дэлегатаў, але ж мясцовыя выканкамы забаранілі праводзіць гэтыя мерапрыемствы, матывуючы адмовы самымі рознымі прычынамі. Звычайныя адпіскі: «Ва ўказаных Вамі памяшканнях будуць адбывацца мерапрыемствы згодна з планамі ўстановаў», ці «Прадставіць для правядзення мерапрыемства залу пасяджэнняў Шчучынскага раённага Савета дэпутатаў не ўяўляецца магчымым». У Мастах адмаўлялі ў афіцыйным правядзенні мерапрыемства 4 разы на працягу 3 месяцаў, у Шчучыне 2 разы.

У выніку на Гродзеншчыне адбылося 6 сходаў, яшчэ 3 маюць адбыцца ў бліжэйшы час. Мясцовую ўладу задавальняе, што гэтыя грамадскія мерапрыемствы праводзяцца не ў афіцыйных памяшканнях, такім чынам чыноўнікі пазбаўляюць жыхароў вобласці права публічна падтрымаць ідэю еўрапейскай будучыні Беларусі і адкрыта прадэманстраваць грамадству сваю падтрымку.

Еўрапейская ідэя аб'ядНала 27 еўрапейскіх краінаў, што разам будуюць свой агульны дом. Беларускі еўрапейскі форум адбудзецца 14 лістапада ў Мінску. Яго мэта — садзейнічаць дыялогу Беларусі з Еўрасаюзам і ўзмацніць еўрапейскі вектар развіцця краіны. Ініцыятарамі правядзення форума і заснавальнікамі аргкамітэта выступілі Рух «За Свабоду», Партыя свабоды і прагрэсу, «Маладая Беларусь», «Правы альянс» і іншыя дэмакратычныя арганізацыі. Старшынёй аргкамітэта па правядзенні форума абраны Аляксандр Мілінкевіч.

ПАРТЫІ

# БХД БУДЗЕ ВЫПРАБОЎВАЦЬ ПАРТНЁРАЎ МАРОЗАМ

Вольга ХВОІН

**Беларускія хрысціянскія дэмакраты рыхтуюцца да суду, з'езду на вуліцы і стварэння кааліцыі.**


Фота Юрыя Дзядзінкіна

Паўторны ўстаноўчы з'езд партыі «Беларуская хрысціянская дэмакратыя» адбудзецца 31 кастрычніка пры любым раскладзе, заявіў сустаршыня аргкамітэта па стварэнню партыі Павал Севярынец. У шэрагу ключавых пытанняў з'езда ўдзел БХД у прэзідэнцкай кампаніі 2010–2011 года і ў мясцовых выбарах 2010 года.

Хадэкі абяцаюць, што восеньскі з'езд будзе «больш моцны, больш яркі і больш шматлюдны» за зімовы. Чакаецца ўдзел блізу сямісот чалавек, з іх больш за трыста — дэлегаты, астатнія — госці і партнёры аргкамітэту партыі. Аднак пакуль што выглядае на тое, што ўвесь арганізатарскі талент давядзецца дэманстраваць на вуліцы. На ўсе адзінаццаць заяў на арэнду памяшкання прыйшлі адмовы. Апошняй стала адмова ў арэндзе малой залі Палаца Рэспублікі.

Паўла Севярынца такі расклад не бянтэжыць: «У некаторым сэнсе з'езд на плошчы будзе яшчэ больш паказальным, чым у залі. Калі замежнікам, якія прадстаўляюць кіруючыя партыі Еўропы, давядзецца напрыканцы кастрычніка стаяць на марозе насупраць Адміністрацыі прэзідэнта, то гэта будзе цудоўная ілюстрацыя да так званай лібералізацыі, сцвярджэнняў рэжыму пра тое, што ў нас адбываюцца грунтоўныя, пазітыўныя змены. Вось, калі ласка, вам карцінка».

Паводле слоў Севярынца, правядзенне ўстаноўчага сходу БХД з'яўляецца не толькі ўнутраным пытаннем, але і адным з крытэраў, паводле якіх будзе прымацца рашэнне пра далейшую палітыку ЕС у дачыненні да Беларусі.

Акрамя падрыхтоўкі да ўстаноўчага з'езда, аргкамітэт партыі БХД займаецца і судовымі справамі. У Суд Першамайскага раёна Мінска ад імя сустаршыняў БХД Паўла Севярынца і Віталя Рымашэўскага была накіравана скарга на Нацыянальную дзяржаўную тэлерадыёкампанію Рэспублікі Беларусь. Падставай стаў выхад 27 верасня ў перадачы «Панорама недели» (канал «Беларусь–ТВ») сюжэта пра дзейнасць БХД. «Наш зварот, накіраваны ў Белтэлерадыёкампанію два тыдні таму з патрабаваннем абвергнуць хлусівыя звесткі наконт «Беларускай хрысціянскай дэмакратыі», застаўся без адказу.

«Паводле заканадаўства, БТ было абавязана на працягу пяцідзённага тэрміну абвергнуць гэтыя звесткі ці на працягу дзесяці дзён адмовіць нам у гэтым абвяржэнні, — тлумачыць рашэнне судзіцца Павел Севярынец. — Таму зараз мы падаём заяву ў суд з патрабаваннем прымусіць БТ абвергнуць гэтыя звесткі, а таксама падаём заяву ў пракуратуру, бо БТ на наш зварот ніяк не адрэагавала».

На наступным тыдні аргкамітэт па стварэнню партыі «Беларуская хрысціянская дэмакратыя» ўступіць у нацыянальна-дэмакратычную кааліцыю. Пакуль не зусім зразумела, чым новы саюз будзе адрозніваця ад старога. Севярынец аптымістычна заявіў, што галоўнай прыкметай кааліцыі будзе «ідэйнае адзінства, незалежніцкія, хрысціянскія і еўрапейскія каштоўнасці».

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# ЛУКАШЭНКУ НАДАКУЧЫЛА БЫЦЬ ПРЭЗІДЭНТАМ?

Сяргей САЛАЎЁЎ




**Канец мінулага тыдня і пачатак гэтага не абяцалі ніякіх сенсацый. Усё было ціха, спакойна, і нават прымаўка пра тое, што лепшая навіна — гэта адсутнасць навінаў, цалкам сябе апраўдвала. Але ж у сярэдзіне тыдня мы дачакаліся сенсацыяў. Ды яшчэ якіх!**

20 кастрычніка Аляксандр Лукашэнка сустрэўся са старшынёй Цэнтрвыбаркама Лідзіяй Ярмошынай. Ён шмат з кім сустракаўся без асаблівых вынікаў. Але зараз вынікі ашаламляльныя: было прынята рашэнне, што чарговыя прэзідэнцкія выбары ў Беларусі пройдуць у пачатку 2011 года, а выбары ў мясцовыя саветы — у другой палове вясны 2010 года.

Раней выказвалася хваляванне, што ўлады могуць сумясціць гэтыя кампаніі. Але Лукашэнка — супраць. Паводле яго слоў, сумясціўшы абедзве кампаніі, «мы мала што выйграем эканамічна і фінансава, але паставім пад пытанне найперш прэзідэнцкія выбары». «Таму я прыхільнік таго, каб «развесці» гэтыя палітычныя кампаніі. І як мага большы прамежак пакінуць для падрыхтоўкі да прэзідэнцкіх выбараў», — патлумачыў ён.

Канешне, мы пачулі і пра тое, што Лукашэнка «прыхільнік правядзення чэсных, справядлівых і, самае галоўнае, адкрытых палітычных кампаній — як у саветы дэпутатаў, так і прэзідэнцкай». «Я маю на ўвазе, што трэба даць усім роўныя магчымасці для падрыхтоўкі і ўдзелу ў гэтых кампаніях. Асабліва ў прэзідэнцкай кампаніі», — паведаміў кіраўнік дзяржавы.

Таксама Лукашэнка прыняў рашэнне пра тое, што выбарчае заканадаўства Беларусі будзе лібералізавана. ЦВК унясе шэраг прапаноў, скіраваных на ўвасабленне некаторых прапаноў АБСЕ і беларускіх палітычных партый, якія тычацца мераў па дадатковай ахове скрыняў для галасавання, забеспячэнні надзейнасці датэрміновага галасавання і іншых тэхнічных момантаў.

Што тут можна казаць? Канешне, як казаў таварыш Сталін, галоўнае, не як галасуюць, а як лічаць. Але ж, можа, сам таго не ведаючы, Лукашэнка даў фору беларускай апазіцыі. Бо праца з насельніцтвам — гэта якраз і ёсць моцны бок апазіцыйных арганізацый. Шмат што зрабілі менавіта ў сваіх раёнах прадстаўнікі Руху «За Свабоду», моладзевых арганізацый, іншых няўрадавых структур. Пад іх ціскам мясцовыя ўлады асфальтавалі дарогі, рабілі капітальныя рамонты жылля, асвятлялі вуліцы ў шмат якіх мястэчках... Пра грамадзянскія кампаніі ў Мінску ў абарону Лошыцкага парка, за захаванне Севастопальскага парка, абарону жыхароў вуліцы Карла Маркса ўвогуле можна згадваць доўга. Так што Лукашэнка аддаў апазіцыі даволі перспектыўнае поле для прапаганды сваіх ідэй напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў. Тым больш, што шмат якія лідэры апазіцыйных арганізацый ужо былі дэпутатамі мясцовых саветаў.

З другога боку, Лукашэнка не пакінуў апазіцыі часу «жаваць соплі», бясконца абмяркоўваючы планы стварэння шматлікіх дэмакратычных кааліцый, выстаўляць умовы для выбару «адзінага кандыдата» і абвяргаць іх... Апазіцыя зараз будзе проста вымушаная дзейнічаць «у тэмпе вальса», а патэнцыйныя дэмакратычныя кандыдаты ў прэзідэнты — пазбавіцца шмат якіх уласных амбіцыях і персанальных прэтэнзіяў да сваіх жа калег.

З трэцяга боку, усе разумеюць, што кошты на газ і нафту ад Расіі будуць павышаныя як 1 студзеня 2010 года, так і 1 студзеня 2011 года, што непазбежна выкліча рост камунальных плацяжоў, і, адпаведна, незадавальненне народа. Усе разумеюць, што крызіс у 2010 годзе не скончыцца. Такім чынам, абвяшчэнне выбараў у гэты час — мужны і рызыкоўны крок.

Такое ўражанне, што Аляксандру Лукашэнку папросту надакучыла быць прэзідэнтам. І, быццам, махнуў ён на ўсё рукою: «А каціцеся вы лесам! Самі разбірайцеся з Расіяй, гэтым крызісам, Захадам і Усходам! Надакучыла мне гэта! А як разбярэцеся, можа, праз гадкоў пяць я зноў падам на прэзідэнцтва».

Але здзівіў нас не толькі Лукашэнка. Сапраўды, не толькі палітыка здзіўляе. Зусім нечакана, пасля дамашняга паражэння хакейнай каманды «Дынама» (Мінск) ад хабараўскага «Амура» (з лікам 1:4), трэнерскі штаб хакейнага клуба «Дынама» (Мінск) у поўным складзе адпраўлены ў адстаўку. Пад раздачу тумакоў патрапілі канадзец Глен Хэнлан і яго памочнікі Шон Сімпсан, Дэйв Л'юіс і Уладзімір Цыплакоў.

«Я прыняў рашэнне пра адстаўку, калі ўбачыў сённяшнюю гульню, — растлумачыў свае дзеянні старшыня Федэрацыі хакея Беларусі Уладзімір Навумаў. — Пры такім падборы хакеістаў каманда так гуляць не павінна. Я ўжо казаў, што ў каманды няма характару. Цяперашні трэнерскі штаб яго не выхавае».

«Выхаваць характар» зараз павінен тэрмінова прызначаны на пасаду трэнера «Дынама» былы настаўнік «Гомеля» Аляксандр Андрыеўскі. «Я размаўляў з ім 20 хвілін таму. На маю прапанову ён адказаў маўчаннем, якое раўназначна згодзе», — заявіў Навумаў.

Логіка, канешне, цікавая. Спачатку агаламшыць чалавека, а потым заявіць: «Маўчыш — значыць згодны!»

Тым не менш, у логіцы Навумаву не адмовіш. У той час, як мінскае «Дынама» «зліла» хатнюю гульню, хакеісты «Гомеля» не дазволілі кіеўскаму «Сокалу» вярнуцца на першае месца ў табліцы адкрытага чэмпіянату Беларусі. 20 кастрычніка каманда Аляксандра Андрыеўскага перамагла ўкраінскі клуб у серыі булітаў з лікам 2:1.

І на гэтым жа тыдні высветлілася, што Беларусь усё ж будзе «гуляць у вайнушку». 20 кастрычніка было абвешчана, што ў Сакратарыят АДКБ паступіў падпісаны Аляксандрам Лукашэнкам пакет дакументаў, якія тычацца стварэння Калектыўных сілаў аператыўнага рэагавання АДКБ. Самае цікавае, што Беларусь свае планы па ўдзеле ў гэтых сілах не разгалошвае. У Сакратарыяце арганізацыі заявілі, што звесткі аб колькасным складзе беларускай групоўкі, як, зрэшты, і груповак іншых краін, з'яўляюцца сакрэтнымі і могуць быць абвешаны толькі паводле рашэння кіраўніцтва дзяржавы-ўдзельніцы.

Але што з'яўляецца сакрэтным у Беларусі, тое можна прачытаць у расійскай газеце «Коммерсантъ». Паводле яе звестак, Беларусь пагадзілася накіраваць у распараджэнне КСАР прыкладна 5 тысяч чалавек. Яна нібыта дэлегуе ў склад калектыўных сіл адну брыгаду спецыяльнага прызначэння Узброеных сіл (такой у беларускай арміі з'яўляецца 5-я брыгада спецназу, што дыслакуецца ў Мар'інай Горцы), антытэрарыстычнае падраздзяленне КДБ «Альфа», спецпадраздзяленне МУС «Алмаз» і падраздзяленне МНС.

Так што «гульня ў салдацікі» яшчэ будзе мець працяг.

> Логіка, канешне, цікавая. Спачатку агаламшыць чалавека, а потым заявіць: «Маўчыш — значыць згодны!» Тым не менш, у логіцы Навумаву не адмовіш

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ

### УЛАДЗІМІР САМСОНАЎ



33-гадовы беларускі спартсмен Уладзімір Самсонаў стаў трохразовым уладальнікам Кубка свету па настольным тэнісе. У фінале спаборніцтваў, што прайшлі ў Маскве, Уладзімір, які займае шостае месца ў сусветным рэйтынгу, выйграў у кітайца Чэнь Ці. Самсонаў станавіўся ўладальнікам Кубка свету — выніковым турніры года наймацнейшых тэнісістаў — таксама ў 1999 і 2001 гадах, у 1997 годзе спартовец заваяваў срэбра на чэмпіянаце свету ў асабістым разрадзе, выйграў 18 турніраў Пра-Тура ITTF. Да ўсяго Уладзімір Самсонаў — удзельнік чатырох Алімпіяд (1996, 2000, 2004, 2008), 6-разовы чэмпіён Еўропы ў розных разрадах і 4-разовы пераможца «Еўра-Топ12» (1998, 1999, 2001, 2007), а таксама пяціразовы пераможца еўрапейскай Лігі чэмпіёнаў.

Настольным тэнісам Уладзімір пачаў займацца ў сем гадоў, калі бацькі адвялі яго ў мінскі Цэнтр настольнага тэніса да трэнера Аляксандра Пяткевіча. Пачынаючы з 1994 года Уладзімір выступаў за розныя клубы: нямецкую «Барусію», бельгійскі «Раял Вілет», іспанскі «Club Cajagranada Tenis de Mesa». Цяпер спартовец гуляе за расійскі клуб «Паходня ГАЗПРОМА».

У 2005 годзе Самсонаў рашэннем Міжнароднага алімпійскага камітэта быў удастоены прыза Fair play («справядлівая гульня»). Падставай для гэтага стаў эпізод фінальнага матчу «Еўра-Топ12» супраць расіяніна Аляксея Смірнова. У сёмай, вырашальнай, партыі пры ліку 13:13, калі на падачы Смірнова мячык праляцеў у міліметры ад боку стала, Самсонаў звярнуўся да суддзяў, каб тыя адзначылі дотык. Але суддзі свайго рашэння не змянілі, і Самсонаў, выпраўляючы іх памылку, аддаў два апошнія балы суперніку. Пазней сваю ўзнагароду Уладзімір перадаў Музею алімпійскай славы Рэспублікі Беларусь.

### МІКОЛА СТАТКЕВІЧ



Старшыня аргкамітэта Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Народная Грамада) Мікола Статкевіч раскрыў сакрэты куплі-продажу палітычных структур. Паводле яго слоў, у беларускай палітыцы гандлююць усім: партыямі, часткамі партый, кандыдатамі, рухамі і абласнымі арганізацыямі. Палітык паведаміў інтэрнэт-рэсурсу «Беларускі партызан» тры матывы, па якіх набываецца палітычная структура: перашкодзіць партыі вылучыць пэўнага кандыдата ў прэзідэнты; выкарыстаць партыю для таго, каб вылучыць або падтрымаць іншага кандыдата, якога партыя палічыць прымальным; раскалоць партыю, аслабіць ці дыскрэдытаваць яе кіраўніцтва. Для захопу партыі, па Статкевічу, неабходныя наяўнасць у захопніка вялікіх фінансавых рэсурсаў, групы людзей унутры партыі, якія займаюць, у тым ліку, высокія пасады і гатовыя прадавацца. І трэцяя, абавязковая ўмова — гатоўнасць улады падтрымаць падобную камерцыйную ўгоду. «Інакш такі захоп паспяховым не будзе, бо, зразумейце, сведчанні аб рэгістрацыі партыям выдае і забірае Лукашэнка», — тлумачыць тонкасці палітычнага бізнесу палітык. Паводле яго слоў, кошт партыі залежыць ад унутранага, маральнага стану партыі. Калі партыя дэградуе, яе набыццё абыдзецца досыць танна.

### ВАЛЕРЫЙ ВЯДРЭНКА



Сярод творчых асобаў на гэтым тыдні варта вылучыць фотамастака Валерыя Вядрэнку. У Мінску ў галерэі Касцёла Св. Сымона і Алены адчынілася яго выстава «Апосталы Гервят». Гэта вынік двухгадовай працы над матэрыялам здымкаў касцёла Св. Троіцы (несумненна, аднаго з самых прыгожых у Беларусі) у вёсцы Гервяты Астравецкага раёна. Экспазіцыя складаецца з дзвюх частак. У першай аўтар знаёміць гледача з мясцовасцю, касцёлам і яго інтэр'ерам. Стыль серыі вызначыў час пабудовы храма — канец XIX стагоддзя, час рамантычнай неаготыкі. Другая частка выставы — гэта фотапластычная кампазіцыя на тэму выяваў з Евангелля. Фотамастак адзначае, што выстава не прысвечаная выключна рэлігійнай тэме. «Касцёл ідэальна ўвасабляе ўяўленне аб архітэктуры. Мне не падабаецца архітэктура функцыянальная, сучасная. Касцёл — гэта таксама архітэктура, але яна прысвечаная ірацыянальнаму. Калі разглядаць яго з пункту гледжання карысці, то ён абсалютна некарысны. У ім многа дэкаратыўных элементаў, непатрэбных дэталяў. Але менавіта дзякуючы ім, сваёй нефункцыянальнасці, ён такі прыгожы. А нашы дамы з-за сваёй жорсткай функцыянальнасці непрыгожыя», — падсумоўвае сваю канцэпцыю прыгажосці ў архітэктуры Валерый Вядрэнка.

АЗБУКА ПАЛІТАЛОГІІ

# РЭЙТЫНГІ СМЕШНЫЯ І НЕ ВЕЛЬМІ

Сяргей НІКАЛЮК

**Вынікі вераснёвага апытання НІСЭПД не засталіся незаўважанымі. У якасці прыкладу спашлюся на артыкул «Рэйтынг у Лукашэнкі смешны, а перамога будзе элегантнай?», які быў растыражаваны незалежнымі СМІ.**



Ужо стала традыцыйным, што з усяго масіву дадзеных, якія публікуюцца штоквартальна сацыёлагамі НІСЭПД, «шырокую грамадскасць» (дый «вузкае кола абмежаваных людзей», якіх называюць экспертамі) цікавіць у асноўным рэйтынг Лукашэнкі. Ва ўмовах не проста аўтарытарнага рэжыму, а персаналістычнага аўтарытарнага рэжыму такая цікавасць зразумелая. Як казаў у свой час паэт Уладзімір Маякоўскі: «Мы кажам — партыя, разумеем — Ленін». Ён жа наіўна лічыў, што існуе і зваротная залежнасць («Мы кажам — Ленін, разумеем — партыя»).

Аднак пошук фактаў, якія пацвярджаюць наяўнасць зваротнай залежнасці, — задача не самая простая. Так ужо сталася, але асаблівай схільнасці да кіраўнічай «групавухі» на родных прасторах ні грамадства, ні эліта — прынамсі, за апошнія 300 гадоў — не выказвалі. Прапагандысцкія кампаніі за вяртанне «да ленінскіх нормаў калектыўнага кіраўніцтва», якія перыядычна ўзнікалі ў савецкія гады, заўсёды былі кароткатэрміновымі. Іх пачыналі наноў абраныя генсекі, і яны ж іх згортвалі па меры вызвалення ад былых паплечнікаў, з якімі яны былі на «ты» пры сваім папярэдніку.

Мабыць, галоўнай асаблівасцю айчыннай «вертыкалі» ўлады з'яўляецца яе перагорнутасць. Піраміда ўлады стаіць не на сваёй аснове, а на вяршыні. Адсюль і знакамітае пытанне: «А што ж зараз будзе?», якое выказвалі мільёны савецкіх людзей пасля смерці Леніна, потым Сталіна і г.д. Але ж былі, ёсць і яшчэ доўга будуць працягвацца змаганне за ўладу і барацьба за права апынуцца на вяршыні перагорнутай піраміды.

## Пра сціпласць аўтарытарызму

Апісаная вышэй геаметрычная канструкцыя ўлады азначае, што акрамя свайго ўласнага рэйтынгу першай асобе, па вялікім рахунку, больш няма на што абаперціся. Яе рэйтынг выконвае ролю адзінага палітычнага інстытута. Іншых інстытутаў папросту няма. «А як жа сілавыя структуры?» — спытае чытач. Сказаць, што ад іх зусім няма ніякай карысці, язык не паварочваецца, але іх ролю пераацэньваць не варта.

Спашлюся ў чарговы раз на міністра эканомікі фашысцкай Германіі Альберта Шпеера: «Татальная мабілізацыя працоўнай сілы ў дэмакратычнай Англіі і досыць нядбайнае стаўленне да рашэння гэтай праблемы ў Германіі сведчылі пра тое, што, як ні дзіўна, менавіта аўтарытарны рэжым імкнуўся прыцягнуць на свой бок сімпатыі народа… Боязь выклікаць незадаволенасць народных мас прымушала выдаткоўваць сродкі на вытворчасць тавараў народнага спажывання, на выплату дапамогі ўдзельнікам вайны і кампенсацыі жанчынам, якія страцілі ў заробку з-за сыходу мужоў на фронт. І нам даводзілася марнаваць значна больш сродкаў, чым выдаткоўвалі ўрады дэмакратычных дзяржаў».

Цікавы прыклад. Здавалася б, каму-каму, а Гітлеру, ды яшчэ ва ўмовах вайны, для ўтрымання ўлады цалкам хапіла б эсэсаўцаў Гімлера, а ён непакоіўся з нагоды нейкіх там кампенсацый жанчынам. У гэтай сувязі згадваецца знакаміты зварот Чэрчыля да нацыі: «Мне няма чаго прапанаваць вам, акрамя крыві, поту і слёз».

Таталітарныя/аўтарытарныя лідэры, што прыйшлі да ўлады ў выніку дэмакратычных выбараў, на такую шчырасць не здольныя. Іх стыхія — дэмагогія. Менавіта яна забяспечыла ім перамогу на першых выбарах. Гэта потым ужо пачаў працаваць адміністрацыйны рэсурс, але яго магчымасці не бязмежныя. Акрамя таго, «пераможцы» не маюць ілюзій наконт усенароднай любові. У свой час яны набылі яе за кошт заведама невыканальных абяцанняў, а таму асуджаныя і далей весці камерцыйны гандаль з грамадствам. Шчырасць у стылі Чэрчыля дадатковай падтрымкі ім не прынясе, і няхай нават гарматы ворага ўжо абстрэльваюць сталіцу, «усенародна абраны» будзе паўтараць пра цудадзейную зброю, што здольная пераламаць ход вайны, аднак адмовіцца ад правядзення татальнай працоўнай мабілізацыі.

Перанясемся з мінулага ў сучаснасць і паглядзім на заходняга і ўсходняга суседа Беларусі. Польшча — адзіная краіна ў ЕС, у якой ВУП працягвае расці. Гэта не перашкодзіла палякам пачаць пенсійную рэформу. Яе сутнасць зводзіцца да таго, што ў дзесяткі разоў зменшаецца колькасць людзей, што маюць права на датэрміновы выхад на пенсію. Польшча за кошт гэтага кроку падвысіла сярэдні фактычны ўзрост выхаду на пенсію на 5 гадоў. У Расіі ВУП ужо скарачаецца на 10 працэнтаў. І вось на вастрыні крызісу расійскі




Дынаміка адказаў на пытанне: «Як Вы думаеце, А. Лукашэнка настолькі добра спраўляўся з абавязкамі прэзідэнта, каб быць зноў абраным на гэтую пасаду, або Вы лічыце, што прыйшоў час даць шанец каму-небудзь іншаму выконваць гэтыя абавязкі?», %

| Варыянт адказу | 06'04 | 09'05 | 02'06 |
|---|---|---|---|
| Даць шанец новаму чалавеку | 56,4 | 44,8 | 37,0 |
| Зноў абраць А. Лукашэнка | 21,5 | 44,3 | 53,4 |

ўрад абвяшчае пра падвышэнне пенсій на 50 працэнтаў.

Ва ўлады дэмакратычнай і ва ўлады аўтарытарнай розныя часавыя гарызонты планавання, і стаўленне да пенсіянераў у гэтым сэнсе служыць выдатным індыкатарам. Пенсійныя абавязанні маюць доўгатэрміновы характар. Надзвычай лёгка пенсіі падвысіць, але калі ў вас у бюджэце не будзе грошай, то іх немагчыма знізіць. У Расіі антыкрызісны бюджэт прыняты з дэфіцытам у 8 працэнтаў. Для яго пакрыцця давялося адкрыць Рэзервовы фонд. Ужо да сярэдзіны 2010 года грошы скончацца.

Але сёння такая дробязь нікога не хвалюе. Дума нібы вады ў рот набрала. Дзівіцца гэтаму не даводзіцца. Расійскія дэпутаты паводзяць сябе ў поўнай адпаведнасці з выказваннем свайго старшыні: «Парламент — не месца для дыскусій». А вось у Польшчы ўсе «антынародныя» рашэнні былі прынятыя Соймам. Народныя выбраннікі пайшлі на такія непапулярныя меры, таму што яны адчуваюць сваю адказнасць за лёс краіны.

## Феномен «новага чалавека»

Гіпертрафаваная ўвага, якую аналітыкі надаюць рэйтынгу «адзінага беларускага палітыка», ёсць кармавая база міфа пра ролю харызмы ў палітыцы. Звернемся да лічбаў. У верасні за Лукашэнку былі гатовыя галасаваць 39,4% беларусаў, за Мілінкевіча — 3,4%, за Казуліна — 2,0%. Яшчэ 13 асобаў не змаглі пераскрочыць праз парог у 1%. Здавалася б, больш відавочнай ілюстрацыі адсутнасці вартых супернікаў Лукашэнкі ў асяроддзі апазіцыі нават цяжка прыдумаць.

Адсюль шматлікія прапановы па пошуку «новага чалавека». Да такога пошуку падштурхоўваюць і вынікі сацапытанняў. «Новы чалавек» — адзіны палітык, здольны перайграць Лукашэнку. Калі б ён высунуў сваю кандыдатуру супраць Лукашэнкі ў верасні, то перамог бы з лікам 50,2 на 37,4. І гэта перамога для яго была б далёка не першай. У чэрвені 2004 года перавага «новага чалавека» была яшчэ большай: 56,4 на 21,5! Толькі вось па меры набліжэння выбараў гэта перавага паступова выпарылася (гл. табліцу).

Беларусы — людзі практычныя. Адна справа — абстрактныя пакуты з нагоды «новага чалавека» задоўга да прэзідэнцкіх выбараў, і зусім іншае — прыняцце пэўнага рашэння ў дзень галасавання. Як гаварыў вядомы персанаж з вядомага мультфільма: «Я цябе выбіраю. Я з табой шмат гадоў знаёмы, а гэтага ката першы раз бачу».

Патрэба ў стабільнасці — адна з базавых патрэбаў чалавека. Узгадаем лёс Гарбачова, Ельцына, Кебіча, Шушкевіча. І сёння стаўленне да іх у цэлым вельмі негатыўнае. Іх імёны ў грамадскай свядомасці шчыльна звязаныя з развалам Вялікай краіны, за якім надышоў хаос. Ніякімі рацыянальнымі тлумачэннямі тут не дапаможаш. Рацыянальнасць ніколі не была моцным бокам грамадскай свядомасці, якой значна прасцей аперыраваць эмацыйнымі адзнакамі.

А вось палітык, чый прыход ва ўладу супаў са стадыяй аднаўленчага росту, незалежна ад асабістых характарыстык аўтаматычна запісваецца ў харызматыкі. Класічны прыклад — Пуцін, гэты «Малчалін на пасадзе нацыянальнага лідэра» (паводле трапнага выразу сацыёлага Льва Гудкова). Ну а далей пачынае працаваць логіка ўспрымання ўлады аўтарытарным грамадствам, якому чужыя ўсе гэтыя заходнія прыбамбасы ў выглядзе падзелу ўладаў і пошуку кампрамісаў праз дыялог.

Звернемся ў чарговы раз да Альберта Шпеера: «Чым бы ні кіраваўся Гітлер, калі заводзіў гаворку пра свой датэрміновы адыход ад палітыкі, ён у гэтыя хвіліны, безумоўна, кіраваўся думкай, што не магнетызм яго асобы, а толькі ўлада, засяроджаная ў яго ў руках, ёсць крыніца і аснова яго аўтарытэту». І яшчэ адна цытата: «Німб навакол Гітлера быў непараўнальна ярчэйшы ў вачах тых яго супрацоўнікаў, якія не ўваходзілі з ім у цесны кантакт, чым сярод яго найбліжэйшага асяроддзя. Там Гітлера не называлі паважліва «фюрэр», а казалі проста «шэф», там абыходзіліся без «хайль Гітлер», кажучы «добры дзень».

Так фармуецца безальтэрнатыўнасць. З боку грамадства — попыт. З боку ўлады — прапанова. На палітычным рынку Беларусі яны выдатна знаходзяць адзін аднаго. Невыпадкова на пытанне: «Як Вы думаеце, чаму шматлікія людзі давяраюць прэзідэнту А. Лукашэнку?» самым папулярным у верасні быў адказ: «Людзі не бачаць, на каго іншага яны яшчэ маглі б разлічваць» (44,2%). А як жа «новы чалавек»? Пра «новага» можна толькі марыць, а марыць, як вядома, не шкодна.

## На няма і суду няма

І ў заключэнні вернемся да артыкула пра смешны рэйтынг. Рэйтынгавая перавага Лукашэнкі над сваімі рэальнымі супернікамі бясспрэчная. Вядома, 39,4 працэнта далёкія ад 95-ці, якія са сціпласці давялося адкарэктаваць, але, усё роўна, новая выбарчая гульня будзе гульнёй у адны вароты. У гэтай сувязі аўтар артыкула выказвае здзіўленне з нагоды няўступлівасці ўлады ў пытанні карэкціроўкі выбарчага заканадаўства: «У такой сітуацыі, здавалася б, улада магла б смела адкінуць усе асцярогі, звязаныя са зменай выбарчага заканадаўства, — вылучайцеся, назірайце, лічыце».

Справа, аднак, не ў арыфметыцы. 95 працэнтаў — не са столі ўзятыя. За імі стаіць сутнасць аўтарытарнага рэжыму. Вось улада, а вось згуртаваны вакол яе народ. Пры такой канструкцыі няма неабходнасці не толькі ў палітычных пасярэдніках у выглядзе партый, але не ўзнікае і патрэбы ў палітыцы, калі пад апошняй разумець узгадненне інтарэсаў розных груп. А што ёсць? Ёсць толькі інтарэс улады.

ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА

# Яраслаў Грышчэня: НЕЛЬГА ЗМАГАЦЦА З СІСТЭМАЙ ЛОЗУНГАМІ




Марыя КРУК

**Прыняты напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў 2006 года артыкул 193.1 Крымінальнага кодэкса (дзейнасць незарэгістраванага аб'яднання, рэлігійнай арганізацыі альбо фонду) хутка быў задзейнічаны на практыцы для барацьбы з актывістамі няўрадавых арганізацый. На 1 чэрвеня 2009 года праваабаронцы зафіксавалі 17 выпадкаў, калі грамадзяне Беларусі былі асуджаныя паводле артыкула 193.1.**


Фота Юрыя Дзядзінкіна

Лёс фігурантаў гэтых спраў склаўся па-рознаму. Некалькі чалавек з'ехалі за мяжу: нехта на працу, нехта на вучобу. Большасць жа з іх засталіся ў Беларусі і працягваюць сваю дзейнасць у НДА розных накірункаў.

Напрыклад, лідэр «Маладога Фронту» Зміцер Дашкевіч пасля адбывання тэрміну ў калоніі працягвае сваю дзейнасць у палітычным рэчышчы. Эніра Браніцкая працуе ў камітэце «Салідарнасць», дапамагае тым, хто пацярпеў за сваю нязгоду з цяперашняй дзяржаўнай сістэмай. Аднак не варта забывацца пра тое, што ўсе фігуранты спраў па артыкулу 193.1 — поўныя імпэту маладыя людзі. Рынуўшыся з галавой у адстойванне сваіх ідэалаў і перакананняў, яны сутыкнуліся з рэпрэсіямі, што не маглі не паўплываць на іх светапогляды.

Маладзевы актывіст з гораду Баранавічы Яраслаў Грышчэня быў асуджаны за парушэнне артыкулу 193.1 Крымінальнага кодэксу ў верасні 2007 года. Падчас судовага разбіральніцтва пракурор прапанаваў пакараць актывіста адным годам пазбаўлення волі ўмоўна. Суддзя Васіль Петрыў прысудзіў Яраславу штраф у 30 базавых велічынь.

Яраслаў з'ехаў вучыцца ў Польшчу па праграме Каліноўскага — у Познанскі універсітэт, калегіум еўрапейскі ў Гнезна. Аптымістычны па жыцці Яраслаў прыйшоў да прыкрых высноў, ацаніўшы сваю сітуацыю на адлегласці двух гадоў.

— Гэтыя прысуды далі мне зразумець, што шараговыя людзі ў апазіцыі — прабачце — толькі «мяса». Пасля майго суду недзе два тыдні журналісты тэлефанавалі, цікавіліся, а пасля ўсё. І так не толькі са мною, з усімі. Я разумею, што журналісты працуюць на падзею і навіны, але размова больш пра кіруючыя вярхі. Лідэры пэўных палітычных структур, калі ім трэба, пачынаюць шукаць падтрымку маладых. А без уласных матываў — маўчок. Мне падаецца, што апазіцыя сама па сабе перспектыў не мае, іх маюць людзі, якія трымаюцца на ідэі.

На ўсе нашы справы была замова «зверху». Я ішоў на суд і сам сабе рабіў стаўкі: ці штраф, ці тэрмін. Гэта было шоу, паказальнае шоу. У 2006 годзе пасадзілі Цімафея Дранчука. Чым скончылася? Пагаварылі некаторы час і забыліся, але высноў для сябе ніхто не зрабіў. Напрыклад, што з сістэмай крыкам і лозунгамі немагчыма змагацца. Бо асноўная маса людзей мае свае каштоўнасці і патрэбы, адрозныя ад дэкларуемых апазіцыяй. Сістэму можна перамагчы такой жа самай сістэмай. Мы нічога не зрабілі для развіцця мыслення людзей. Падчас усіх кампаній традыцыя грошы на нейкую атрыбутыку, мёртвыя праекты. А добрыя кнігі выдаюць невялікім накладам. Дарэчы, мне падаецца, што вельмі добрай ідэяй быў выпуск серыі музычных дыскаў «За свабоду».

***— Ты атрымаеш еўрапейскі дыплом, і што далей?***

— Прыеду ў Беларусь і буду самарэалізоўвацца. Мне цікавая сфера музыкі. У Беларусі ёсць шоу-бізнес і ёсць музыка. У першым поўнае фуфло, хаця там многа грошай, ёсць яшчэ канцэрты «За Беларусь». Гэта ўвогуле супер! Чалавек спіць дома, а заўтра выходзіць і пяе, бо яго паклікалі. Дык вось гэта мне не цікава. Я хачу займацца менавіта музыкай. У нас ёсць добрыя выканаўцы і кантынгент пад іх. Толькі што гэтым мала хто займаецца. Але ў цэлым, каб нешта рабіць, трэба прыкрыць пасаду ідэолага. Напрыклад, мы хацелі правесці ў Баранавічах «Ноч пажыральнікаў рэкламы», дык кіраўніца мясцовага аддзела ідэалогіі адмовіла. Хаця ўсе ўстановы пагадзіліся.

***— На Захад і ў Расію з'язджае шмат моладзі, якая шукае сваё месца пад сонцам. А ты не хочаш застацца за мяжой?***

— На Захад дакладна з'язджаюць касякамі, прычым рознымі спосабамі. Я асабіста ведаю тых, хто з'ехаў па псеўдапалітычнай лініі. Я вельмі паважаю працу камітэта «Салідарнасць» і Іны Кулей, але адбор тых жа навучэнцаў на праграму Каліноўскага мусіць быць больш жорсткім.

Што тычыцца эміграцыі, дык тут, у Еўропе, усім усё роўна. Гавораць: «Мы б хацелі нешта зрабіць для падтрымкі беларусаў». Але як даходзіць да справы, то звычайна на словах усё і заканчваецца. Ва ўсіх свае справы і сваё жыццё. Ніхто не будзе вас тут чакаць з шырокімі абдымкамі.

***— Цяпер тваё жыццё паміж дзвюма краінамі. Нейкімі назіраннямі падзелішся?***

— У Беларусі за гэтыя два гады нічога не змянілася, акрамя кошту і заробкаў. Першыя растуць, другія — падаюць.

ЭКАЛОГІЯ

# Андрэй Ажароўскі: НЕ ЗРАЗУМЕЛА, ХТО І ЧАМУ Б'ЕЦЦА Ў БЕЛАРУСІ ЗА АЭС

Вольга ХВОІН

**Удзельнікі міжнароднай канферэнцыі «Праблемы ядзерных адкідаў: ад здабычы урану да адпрацаванага ядзернага паліва», якая адбылася ў Стакгольме, звярнуліся да ўрада Беларусі з заклікам не прызнаваць грамадскія слуханні па АЭС, што адбыліся на пачатку кастрычніка ў Астраўцы, з-за парушэнняў правоў чалавека.**


Фота Юрыя Дзядзінкіна

Нагадаю, што вядомага расійскага эколага, эксперта групы «Экаабарона» Андрэя Ажароўскага асудзілі да сямі сутак арышту за спробу распаўсюдзіць даклад «Крытычныя заўвагі да ацэнкі ўздзеяння на навакольнае асяроддзе (АУНА) беларускай АЭС», адным з аўтараў якога і з'яўляецца эксперт.

«Мы выяўляем глыбокую занепакоенасць парушэннем правоў чалавека, падманам і фальсіфікацыяй, што былі дапушчаны Міністэрствам энергетыкі, гарадской адміністрацыяй і супрацоўнікамі міліцыі падчас так званых «грамадскіх слуханняў па ацэнцы ўздзеяння на навакольнае асяроддзе АЭС» 9 кастрычніка ў Астраўцы, Беларусь», — гаворыцца ў рэзалюцыі міжнароднай канферэнцыі па праблеме ядзерных адыходаў, якая адбылася ў Стакгольме. Таксама ўдзельнікі канферэнцыі заклікаюць урад Беларусі прытрымлівацца патрабаванняў Орхускай канвенцыі і Канвенцыі Эспа, якія ратыфікавала дзяржава. Паводле меркавання эколагаў, замацаванае Орхускай канвенцыяй права на доступ да інфармацыі і яе распаўсюджванне было парушана забаронай аргкамітэта слуханняў на распаўсюджванне крытычных матэрыялаў падчас мерапрыемства. У афіцыйных матэрыялах АУНА ацэнка магчымых выкідаў радыенуклідаў заніжаная ў 320 разоў, небяспечныя наступствы выкідаў нават не згаданыя, адсутнічае апісанне абыходжання з ядзернымі адкідамі і адпрацаваным ядзерным палівам, план вываду станцыі з эксплуатацыі.

«Мы выказваем салідарнасць з Антыядзерным рухам Беларусі і заклікаем улады Беларусі ўстрымацца ад рэпрэсій у дачыненні да даследчыкаў, актывістаў, эколагаў і навукоўцаў, якія выступаюць з крытыкай выкарыстання ядзернай энергіі і ідэі будаўніцтва атамнай станцыі ў краіне, што мацней за ўсіх пацярпела ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС, — гаворыцца ў заяве.

Пасля свайго вызвалення з-пад арышту і вяртання са Стакгольмскай канферэнцыі Андрэй Ажароўскі адказаў на пытанні «НЧ».

***— Якія ў вас уражанні засталіся пасля арышту?***

— Маё затрыманне было правакацыяй, суд — гэта прыкрыццё правакацыі. Што тычыцца ўмоў утрымання ў ізалятары, то магу сказаць так: холадна, але не прыніжальна. Наогул, пастанова суда ў законную сілу пакуль не ўступіла. Я абскарджу яе ў Гродзенскім абласным судзе. Спадзяюся, мне паведамяць, калі будзе разгляд, бо я даслаў туды адпаведны ліст з просьбай без мяне судовае пасяджэнне не праводзіць. У Беларусі калегі адразу кінуліся мне дапамагаць, перадалі цёплыя рэчы, знайшлі адваката. У Расіі «Экаабарона» і эколага-праваабаронцы цэнтр «Белона» накіравалі афіцыйны зварот на імя міністра замежных спраў РФ Сяргея Лаўрова з просьбай разабрацца з маім арыштам. Супрацоўнік дыпламатычнай місіі Расіі наведаў мяне толькі 14 кастрычніка. Прыехаць у Астравец мае калегі-расіяне не маглі, а падтрымка мне была патрэбная менавіта там.

***— З таго, што вы бачылі і ведаеце, на вашу думку, ці будзе ўвогуле гэта АЭС пабудаваная? Ходзяць размовы пра палітычны фарс і банальнае выпампоўванне рэсурсаў.***

— У любым выпадку, гэта выпампоўванне грошай. Грошы ўжо расходуюцца: будуецца «дарога ў нікуды», гэты спектакль з так званымі слуханнямі арганізавалі. Дарэчы, называць тое, што адбылося ў Астраўцы, слуханнямі — не карэктна. Гэта — збор прыхільнікаў АЭС, арганізаваны Мінэнерга, дырэкцыяй АЭС, якая будуецца, і ўладамі Астравецкага раёна — райвыканкамам і РАУСам. На слуханнях мусяць быць прадстаўленыя ўсе погляды. На слуханнях не робяць так, каб апаненты не змаглі на іх патрапіць.

***— Ці маглі б параўнаць удзел грамадскасці ў рэалізацыі праектаў, якія маюць вялікі экалагічны складнік, у Расіі і Беларусі?***

— Ёсць прыклад сумленных слуханняў. Сёлета ў верасні мясцовыя ўлады горада Мурама Уладзімірскай вобласці не паверылі ў сумленнасць грамадскіх слуханняў Расатама наконт будаўніцтва Ніжагародскай АЭС і правялі ўласныя, якія прадэманстравалі рэальныя адносіны насельніцтва. Падчас слуханняў жыхары горада, які размешчаны ў 20 кіламетрах ад будаўнічай пляцоўкі АЭС, адназначна выказваліся супраць будаўніцтва, абураліся палітыкай прамывання мазгоў і праядзернай прапагандай мясцовых СМІ.

Але і ў Расіі Расатам часта ладзіць маніпуляцыі і правакацыі. Толькі ў нас зразумела: Расатам б'ецца за дзяржаўнае фінансаванне. Хто, чаму і за што б'ецца ў вас — я не ведаю.

Напрыканцы размовы Андрэй Ажароўскі заўважыў, што зможа прачытаць гэты артыкул па-беларуску. «У ізалятары часовага ўтрымання заўсёды працавала радыё — Першы канал», — падзяліўся сваімі «універсітэтамі» расійскі эколаг.

**МЕРКАВАННЕ**

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ БЕЗ СРОДКАЎ І ПАЎНАМОЦТВАЎ

Марына ЗАГОРСКАЯ,
рэдактар сайта «Заўтра тваёй краіны»

**Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі на восеньскай сесіі плануе разгледзець у другім чытанні праект закона «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні». Тым часам прадстаўнікі грамадзянскай супольнасці заклікаюць улады спачатку вызначыцца з канцэпцыяй мясцовага самакіравання. Эксперты ўпэўненыя, што заканадаўства павінна адпавядаць Еўрапейскай хартыі. Але наша краіна, у адрозненне ад суседзяў, яе яшчэ не ратыфікавала.**



Асветніцкае грамадскае аб’яднанне «Фонд імя Льва Сапегі» спецыялізуецца на пытаннях мясцовага самакіравання. Яго прадстаўнікі раяць уладам даверыць аналіз беларускага заканадаўства спецыялістам Рады Еўропы і на падставе іх высноў распрацаваць новую нацыянальную канцэпцыю мясцовага самакіравання.

Фонд накіраваў зварот са сваімі прапановамі ў абедзве палаты Нацыянальнага сходу, у Адміністрацыю прэзідэнта, Канстытуцыйны суд, Міністэрства юстыцыі і іншыя зацікаўленыя міністэрствы і ведамствы, дыпламатычныя прадстаўніцтвы і міжнародныя структуры.

Старшыня праўлення «Фонду імя Льва Сапегі» Міраслаў Кобаса спадзяецца, што парламентарыі прыслухаюцца да меркавання прадстаўнікоў грамадзянскай супольнасці.

— Мы не бачым ніякага сэнсу ў прыняцці парламентам дакумента ў такім выглядзе, у якім ён знаходзіцца цяпер. Праект закона быў распрацаваны ў 2007 годзе ў цалкам іншай палітычнай сітуацыі. Цяпер адбываецца больш кантактаў і з Еўракамісіяй, і з Еўрасаюзам, і з Радай Еўропы, — падкрэслівае Міраслаў Кобаса. — Да таго ж, Адміністрацыя прэзідэнта ўнесла гэты законапраект на разгляд парламента з мэтай уніфікацыі заканадаўства. Гэта ў большай ступені тэхнічная працэдура, чым даўно наспелая рэформа сістэмы, якая дазволіла б на справе прымаць рашэнні на мясцовым узроўні і максімальна задзейнічаць у гэтым працэсе шараговых грамадзян.

***— Якія асноўныя прэтэнзіі экспертаў да праекту новага закона аб мясцовым самакіраванні?***

— У праекце новага закона аб мясцовым самакіраванні захоўваецца самая галоўная з супярэчнасцяў, якія існавалі дагэтуль, — органы мясцовага кіравання на самай справе такімі ў Беларусі не з’яўляюцца. Яны не маюць ні паўнамоцтваў, ні фінансаў. Яны не валодаюць прыкметамі юрыдычнай асобы і абавязаныя абараняць агульнадзяржаўныя інтарэсы.

Формы ўдзелу грамадзян у мясцовым самакіраванні таксама застаюцца досыць абмежаванымі. У Канстытуцыі Беларусі прапісана, напрыклад, што грамадзяне ажыццяўляюць мясцовае самакіраванне таксама праз органы тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання — мясцовыя рэферэндумы, выбары, мясцовыя сходы, правотворчую ініцыятыву. Але для таго, каб сёння правесці мясцовы рэферэндум, трэба сабраць не менш за 10 працэнтаў подпісаў ад колькасці грамадзян, якія пражываюць на дадзенай тэрыторыі. Гэта вельмі высокая планка.

Яшчэ адзін хітрык: рэферэндум праводзіцца па «пытаннях, якія маюць важнейшае значэнне». А хто вызначае важнасць? Міністэрства юстыцыі або яго структуры. Ці можна тады наогул назваць мясцовы рэферэндум формай прамога народаўладдзя, калі грамадзяне не могуць правесці яго без дазволу ўладаў? На маю думку, ужо сам факт збору подпісаў даказвае важнасць для грамадзян таго або іншага пытання.

Да таго ж, законам прадугледжана, што калі грамадзяне ініцыююць рэферэндум, то і праводзіцца ён павінен за іх кошт. Пры такіх складаных працэдурах і фінансавых выдатках грамадзяне сто разоў падумаюць, перш чым адважацца ініцыяваць рэферэндум.

У праекце новага закона нямала таго, што выразна сведчыць: заканадавец па-ранейшаму пабойваецца пашыраць магчымасці мясцовага самакіравання.

***— Можаце прывесці пэўныя прыклады?***

— Адзін з прынцыпаў мясцовага самакіравання — галоснасць. Але калі дакумент будзе прыняты ў цяперашнім выглядзе, то, на наш погляд, доступ да інфармацыі наконт працы мясцовых саветаў толькі ўскладніцца. У законе, які дзейнічае зараз, адзначаецца, што кожны грамадзянін мае магчымасць атрымаць дакументы, якія «непасрэдна закранаюць яго інтарэсы». У праекце новага закона гэтага ўжо няма. Другі нюанс — раней пра дзейнасць савета інфармавалі грамадскія арганізацыі, працоўныя калектывы, грамадзян. Цяпер загадана «інфармаваць арганізацыі і грамадзян». Кіруючыся такой фармулёўкай, саветы могуць інфармаваць выключна дзяржаўныя арганізацыі, а грамадскія — не.

***— А ці ёсць у праекце новага закона станоўчыя змены?***

— Так. Прынята палітычнае рашэнне пра стварэнне асацыяцый мясцовых органаў улады. Гэта пашырае магчымасці прадстаўлення інтарэсаў тэрытарыяльнага самакіравання перад цэнтральнымі органамі ўлады, урадам, Адміністрацыяй прэзідэнта. Ва ўсіх краінах — чальцах Рады Еўропы, напрыклад, любы закон, які датычыцць мясцовага самакіравання, абавязкова падлягае ўзгадненню з асацыяцыяй мясцовых органаў улады.

Другі станоўчы момант — заканадавец зрабіў спробу раскласці паўнамоцтвы па ўзроўню кіравання, каб было зразумела, чым займаецца і за што адказвае сельскі савет. Гэта дазволіць пазбегнуць дублявання.

***— У чым перавагі канцэпцыі мясцовага самакіравання, якая вызначана ў Еўрапейскай хартыі?***

— Беларуская канцэпцыя развіцця мясцовага самакіравання грунтуецца на тым, што ўсе справы ў краіне — знізу да верху — з’яўляюцца дзяржаўнымі. Адсюль, саветы ў нас — дзяржаўныя органы, выканкамы таксама. Еўрапейская ж хартыя пабудавана на прынцыпе дуалізму — гэта значыць, мясцовае самакіраванне спалучае інтарэсы і дзяржавы, і мясцовай супольнасці. Бо мясцовае самакіраванне неабходна для абароны правоў грамадзян, таму што структур, якія адстойваюць дзяржаўныя інтарэсы, хапае.

Напрыклад, ці павінна дзяржава вырашаць, стаяць або не стаяць на вуліцах кіёскам? Ці патрэбны ў нейкі вёсцы аквапарк, або для яе жыхароў важней пабудаваць мост праз раку ці школу адрамантаваць? Гэтыя пытанні павінны знаходзіцца ў кампетэнцыі мясцовай супольнасці, якая лепш ведае свае праблемы. І мае права прэтэндаваць на тое, каб у яе распараджэнні заставалася хаця б частка грошай, якія адпраўляюцца наверх, а потым цэнтралізавана размяркоўваюцца так, што да мясцовага ўзроўню даходзяць дробязі — меней за два працэнты.

***— А ёсць у шараговага грамадзяніна спосаб высветліць, куды сышлі сплачаныя ім падаткі?***

— У нейкі ступені адказ на гэта пытанне дае закон аб бюджэце. Але гэта агульныя пазіцыі. Значна складаней даведацца, што канкрэтна зроблена каля майго дому і колькі гэта каштавала, колькі грошай было вылучана і колькі засвоена.

***— Што рэальна можа сёння мясцовае самакіраванне?***

— Калі прааналізаваць паўнамоцтвы саветаў, то з 25 пунктаў, прапісаных у законе, рэальнымі можна назваць 2–3. Сакрэт хаваецца ў тым, што савет прадстаўляе грамадзян, а бюджэтам распараджаецца адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка. Па законе, савет — юрыдычная асоба, але не мае прыкметаў юрыдычнай асобы — у яго няма свайго рахунку, няма ўласнасці.

***— Чаму так адбываецца?***

— Таму што ў нас няма суб’ектаў самакіравання — таго, што на Захадзе называюць «абшчынай», «камунай», «гмінай», а па-беларуску можна было б назваць «грамадой». Тэрытарыяльная супольнасць грамадзян і павінна быць уласнікам.

***— Як у цяперашніх умовах грамадзяне могуць праявіць сваю ініцыятыву?***

— Могуць напісаць калектыўны зварот, могуць прапанаваць праект рашэння савета — але пра падобны прэцэдэнт я ні разу не чуў. Могуць сход правесці, але для гэтага трэба мець шмат трывання, выдаткаваць нямала сіл і ўкласці свае грошы. Але які сэнс у гэтых сходах, калі на іх не будуць прысутнічаць прадстаўнікі мясцовых органаў улады? А яны наведваць такія мерапрыемствы не абавязаныя.

***— А ці гатовыя грамадзяне браць у свае рукі кіраванне на месцах і падзяляць адказнасць нароўні з дзяржаўнымі органамі?***

— Такі падыход у грамадзян трэба выхоўваць. Але на самай справе, калі б у чалавека была рэальная магчымасць уплываць на тое, што адбываецца там, дзе ён жыве, я думаю, ніхто б не адмовіўся. Але пакуль людзі разумеюць: гэта гульня — выдаткуеш сілы і час, нажывеш ворагаў.

***— Чаму дзяржава павінна быць зацікаўленая ў тым, каб абудзіць мясцовую ініцыятыву?***

— Таму што тады, умоўна кажучы, прэзідэнту не трэба будзе дахі рамантаваць. У дзяржавы ёсць шмат іншых праблем, якія можа вырашыць толькі яна — на цэнтральным, на рэгіянальным узроўні. А на месцах людзі самі могуць зрабіць тое, што датычыць іх штодзённага існавання.

Гэта выгодна дзяржаве, у тым ліку і ў фінансавым плане. Калі ў Польшчы правялі рэформу самакіравання, то паслугі патаннелі на трацiну. Калі ты пачуваешся гаспадаром, то ашчадней ставішся да сродкаў, якія выдаткоўваюцца. А сістэма вертыкалі не дае чалавеку магчымасці праявіць ініцыятыву.

***— Што павінна зрабіць дзяржаву, калі яна зацікаўлена ў тым, каб развіваліся мясцовыя супольнасці?***

— Добраахвотна адмовіцца ад часткі сваіх паўнамоцтваў. Вельмі моцна цэнтралізаваную ўладу і шараговых грамадзян сёння падзяляе велізарная прорва. Чыноўнік залежыць толькі ад вышэйшага начальства, і яму абыякавая рэакцыя людзей на яго дзеянні. У той жа час у Канстытуцыі запісана, што крыніцай улады з’яўляецца народ, што народ ажыццяўляе ўладу праз саветы. А мясцовае самакіраванне, у адпаведнасці з патрабаваннямі Еўрапейскай хартыі, не можа ўваходзіць у сістэму дзяржаўнай улады.

***— Хто або што, на ваш погляд, можа падштурхнуць беларускую ўладу да дэцэнтралізацыі кіравання?***

— Гэта пытанне палітычнае. Магчыма, нашу ўладу падштурхне да разумення гэтага жаданне ўвайсці ў еўрапейскія структуры. Я спадзяюся, што на самім высокім узроўні дзяржаўнага кіравання ёсць людзі, якія глядзяць на перспектыву і ўсведамляюць, што дзяржаве трэба развівацца, а «вертыкаль» на дадзеным этапе тармозіць гэта развіццё.

***— Калі хуткім часам будзе прынята палітычнае рашэнне пра змену канцэпцыі ў адпаведнасці з Еўрапейскай хартыяй, то колькі яшчэ часу спатрэбіцца, каб мясцовае самакіраванне ў Беларусі атрымала такое ж развіццё, як, напрыклад, у Польшчы?***

— Польшча — адзін з самых удалых прыкладаў укаранення сістэмы мясцовага самакіравання сярод краін былога сацлагеру. 20 гадоў мінула з тых часоў, як у гэтай краіне была зменена канцэпцыя мясцовага самакіравання, але нельга сказаць, што ўсе праблемы ўжо вырашаныя. Шараговыя беларускія грамадзяне адчуюць вынікі не менш чым праз 5–7 гадоў. На некаторыя рэчы, у тым ліку і на падвышэнне прававой культуры — як з боку грамадзян, так і з боку чыноўнікаў, — трэба час. Пачынаць варта цяпер. Калі, вядома, зыходзіць з таго, што Беларусь — частка Еўропы.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

TV

## 26 КАСТРЫЧНІКА, ПАНЯДЗЕЛАК

### 1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05, 07.05, 08.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45, 07.45** Зона Х.
**07.30, 08.25, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.30** У свеце матораў.
**09.10** Nota Bene.
**09.40** «Зорныя танцы». «Жаночы сезон».
**11.00** Камедыйная меладрама «Не нарадзіся прыгожай» (Расія).
**12.10** Меладрама «Прыляціць раптам чараўнік» (Расія - Украіна).
**14.05** Жаночае ток-шоу «Жыццё як жыццё».
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.25** Культурныя людзі.
**16.05** Здароўе.
**16.30** Меладрама «Сёстры па крыві».
**17.30** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**18.25** Відэафільм АТН «Прабач мяне».
**18.50, 00.50** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** «Арэна». Праграма аб спорце.
**19.55** Ток-шоў «Ход у адказ».
**21.00** Панарама.
**21.50** Адмысловы рэпартаж АТН «Казахстан: ад світанку да заходу».
**22.05** Вострасюжэтны серыял «Часткі цела».
**23.10** Баявік «Інферна» (ЗША).
**00.55** Дзень спорту.

### ОНТ

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Контуры.
**10.10** АНТ прадстаўляе: «Дыханне планеты».
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** АНТ прадстаўляе: «Рэкламная паўза».
**12.00** «Малахаў+».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.40** «Кантрольны закуп».
**15.15** «Яўлампія Раманава. Следства вядзе дылетант». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** Ералаш.
**16.45** АНТ прадстаўляе: «Бітва тытанаў».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Серыял «Мая выдатная няня», 2004 г.
**18.55** Чакай мяне.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Ток-шоў «Выбар».
**22.00** Прэм'ера АНТ. «Браты-дэтэктывы». Шматсерыйны фільм.
**23.50** Нашы навіны.
**00.05** Навіны спорту.
**00.10** «Злачынствы стагоддзя».
**00.40** «Жанатыя... з дзецьмі». Шматсерыйны фільм.
**01.05** «Звар'яцеў ад цябе». Шматсер. фільм.
**01.30** Нашы навіны.
**01.45** Навіны спорту.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Тыдзень».
**09.35** «Вялікі сняданак».
**10.05** «Пяць гісторый».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.45** «Званая вячэра».
**12.40** «Былая». Серыял.
**13.50** «Зорны рынг».
**15.05** «Далёкія сваякі».
**15.30** «Гарачы лёд».
**16.00** «Культурнае жыццё».
**16.50** «Я - вандроўца».
**17.10** «Наша справа».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Былая». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.20** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Фільм «Вельмі рускі дэтэктыў». Расія.
**22.55** «Сталічныя падрабязнасці».
**23.00** «Сталічны футбол».
**23.30** «Гучная справа».
**00.25** «Класічныя вечары на СТБ».

### ЛАД

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Камедыйны серыял «Юрыкі» (Расія).
**08.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.25** У гэты дзень.
**09.30** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.30** Народная камедыя «Асаблівасці нацыянальнай рыбалкі» (Расія).
**12.10** «Пра мастацтва».
**12.40** Школа рамонту.
**13.30** Моладзевы серыял «Начныя агні пятніцы» (ЗША). 1-я серыя.
**14.20** Мультсерыял «Русалачка» (ЗША).
**14.40** «Хачу ўсё ведаць». Кіначасопіс.
**14.50** Пазакласная гадзіна.
**15.05** Бухта капітанаў.
**15.45** Тэлебарометр.
**16.05** Дэтэктыўны серыял «Камісар Мегрэ» (Францыя-Бельгія- Швейцарыя).
**17.00** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.05** Мюзікл «Ах, вадэвіль, вадэвіль...».
**20.40** Калыханка.
**20.55** Вялікае сэрца.
**21.25** Беларуская часіна.
**22.30** Хакей. Формула гульні.
**23.00** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд.
**23.55** Камедыйны серыял «Юрыкі» (Расія).
**00.25** Дэтэктыўны серыял «Камісар Мегрэ» (Францыя-Бельгія- Швейцарыя).

### РОССИЯ

**07.00** Добрай раніцы, Расія!.
**09.20** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**10.10** «Геніяльны пустэльнік. Вечная музыка Шварца». Дакументальны фільм.
**11.00, 14.00, 17.00, 19.00** Весткі.
**11.25** «Ранішняя пошта».
**11.55** Меладрама «Дзённы цягнік».
**13.35** Гарадок.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.20** Тэлесерыял «Вядзьмарскае каханне».
**15.10** Фільм «Пясочны дождж». 2009 г.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.25** «Гарадок». Дайджэст.
**17.55** Прэм'ера. «Карменіта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.30** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**20.30** Тэлевізійны мастацкі фільм «Ісаеў».
**22.30** Тэлесерыял «Вядзьмарскае каханне».
**23.30** «Нічога асабістага». Інфармацыйна-сатырычная праграма.
**23.45** Навіны - Беларусь.
**23.55** «Весткі+».
**00.15** «Мой срэбны шар».

### НТВ

**05.00** Канал «Сёння раніцай».
**07.45** Проста смачна.
**08.00** Кватэрнае пытанне.
**09.00, 12.00, 18.00, 22.15** Сёння.
**09.20** «Сярэдні клас».
**10.20** Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень.
**11.00** Суд прысяжных.
**12.30** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**14.30** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**15.00** Сёння.
**15.30** Серыял «Ліцэйны, 4».
**17.30** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**18.30** Прэм'ера. Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**20.30** Прэм'ера. Вострасюжэтны серыял «Час Волкава».
**21.30** Сумленны панядзелак.
**22.35** «Калекцыя дурасцяў М.Кананенкі».
**23.10** «Школа зласлоўя».
**00.00** «Quattroruote». Праграма пра аўтамабілі.
**00.35** Камедыя «Рэцэпты анархіста».
**02.40** Асабліва небяспечны!
**03.10** Баявік «Крымінал» (Вялікабрытанія).

### EUROSPORT

**09.30** Ралі. Чэмпіянат свету. «Ралі Вялікабрытаніі». Дзень 3-і.
**10.00** Аўтаспорт. Гонкі ў класе «Турынг». Кубак Еўропы ў Партугаліі. 2-я гонка.
**10.30** Супербайк. Чэмпіянат свету ў Партугаліі. Заезд 2.
**11.30** Матаспорт па выхадных.
**12.00** Горныя лыжы. Кубак свету ў Аўстрыі. Мужчыны. Слалам-гігант. 2-я спроба.
**12.45** Тэніс. Турнір WTA у Расіі. Фінал.
**14.00** Футбол. Чэмпіянат свету да 17 гадоў у Нігерыі. Групавы этап. Гандурас - Аргентына.
**15.30** Футбол. Чэмпіянат свету да 17 гадоў у Нігерыі. Групавы этап. Нігерыя - Германія.
**17.00** Футбол. Чэмпіянат свету да 17 гадоў у Нігерыі (Абуджа). Групавы этап. Уругвай - Паўднёвая Карэя. Прамая трансляцыя.
**19.00** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**19.45** Футбол. Еўрагалы.
**20.00** Футбол. Чэмпіянат свету да 17 гадоў у Нігерыі (Абуджа). Групавы этап. Іспанія - ЗША. Прамая трансляцыя.
**22.00** Пра рэстлінг. Агляд WWE (World Wrestling Entertainment).
**22.30** Пра рэстлінг. Vintage Collection.
**23.30** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб. «Total Knock Out».
**00.30** Вось дык так!!!
**00.45** Футбол. Чэмпіянат свету да 17 гадоў у Нігерыі. Групавы этап. Алжыр - Італія.
**01.45** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**19.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.05** «Соня і яе сям'я», дак. фільм, 2006 г.
**19.45** На колах.
**20.10** Госць «Белсату».
**20.40** Хто ёсць кім: Юрый Хадыка.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Расціслаў Смаленскі».
**21.30** «Мілу ў траўні», маст. фільм, 1990 г., Францыя–Італія.
**23.15** Аб'ектыў.

## 27 КАСТРЫЧНІКА, АЎТОРАК

### 1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.05, 08.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45, 07.45** Зона Х.
**07.30, 08.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** «Арэна». Праграма аб спорце.
**09.05** Ваенная драма «Застава Жыліна».
**09.55** Меладрама «Сёстры па крыві».
**10.50** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**11.40** Адмысловы рэпартаж АТН «Казахстан: ад світанку да заходу».
**12.10** Фантастычны серыял «Зорны крэйсер «Галактыка» (ЗША- Вялікабрытанія).
**13.10** Серыял «Вероніка Марс-2» (ЗША).
**14.05** Ток-шоў «Ход у адказ».
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.25** Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
**15.55** Прэм'ера. Меладраматычны серыял «Сяброўка банкіра» (Расія). 1-я серыя.
**16.50** Меладрама «Сёстры па крыві».
**17.50** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**18.50, 00.45** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** Сфера інтарэсаў.
**19.55** Ваенная драма «Застава Жыліна».
**21.00** Панарама.
**21.50** Вострасюжэтны серыял «Часткі цела».
**22.50** Трылер «Вочы змяі» (ЗША).
**00.50** Дзень спорту.

### ОНТ

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Чакай мяне.
**10.05** «Другое жыццё».
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** АНТ прадстаўляе: «Адзін супраць усіх».
**12.00** «Малахаў+».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.40** «Кантрольны закуп».
**15.15** «Яўлампія Раманава. Следства вядзе дылетант». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Мантэкрыста». Шматсер. фільм.
**17.10** «Хай кажуць».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Камедыйны серыял «Мая выдатная няня», 2004 год.
**18.55** «Рудая». Шматсерыйны фільм.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Галоўная прэм'ера года. «Адмірал». Шматсерыйны фільм.
**22.10** АНТ прадстаўляе: «Што? Дзе? Калі?» у Беларусі. Восеньская серыя гульняў.
**23.25** Нашы навіны.
**23.40** Навіны спорту.
**23.45** «Жанатыя... з дзецьмі». Шматсерыйны фільм.
**00.40** «Звар'яцеў ад цябе». Шматсер.фільм.
**01.30** Нашы навіны.
**01.45** Навіны спорту.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** Фільм «Вельмі рускі дэтэктыў». Расія.
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.45** «Званая вячэра».
**12.40** «Былая». Серыял.
**13.50** «Крокі да поспеху».
**14.40** «Гадкае качаня». Моладзевы серыял.
**15.30** «Top Gear. Руская версія».
**16.50** «Сталічны футбол».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Былая». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.20** «Добры вечар, маляня».
**20.30** «Аўтапанарама».
**20.55** «Мёртвы, жывы, небяспечны». Серыял.
**22.00** «З чаго пачынаецца Радзіма».
**22.55** «Сталічныя падрабязнасці».
**23.00** «Надзвычайныя гісторыі».
**23.55** «Спецназ». Серыял.

### ЛАД

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Камедыйны серыял «Юрыкі» (Расія).
**08.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.30** У гэты дзень.
**09.35** Серыял «Каханне як каханне».
**10.35** Мюзікл «Ах, вадэвіль, вадэвіль...» (СССР).
**11.45** «Запал па культуры».
**12.30** Хакей. Формула гульні.
**13.00** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд.
**13.50** Моладзевы серыял «Начныя агні пятніцы» (ЗША). 2-я серыя.
**14.40** Мультсерыял «Русалачка» (ЗША).
**15.00** «Хачу ўсё ведаць». Кіначасопіс.
**15.15** Пазакласная гадзіна.
**15.30** Свая кампанія.
**16.10** Дэтэктыўны серыял «Камісар Мегрэ» (Францыя-Бельгія- Швейцарыя).
**17.00** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.00** Кінааповесць «Мой сябар Іван Лапшын» (СССР).
**21.10** Калыханка.
**21.25** Беларуская часіна.
**22.25** Спорт-кадр.
**22.55** Камедыйны серыял «Юрыкі» (Расія).
**23.35** Серыял «На рагу ў Патрыяршых-2».
**00.30** Дэтэктыўны серыял «Камісар Мегрэ» (Францыя-Бельгія- Швейцарыя).

### РОССИЯ

**07.00** Добрай раніцы, Расія!.
**09.20** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**10.10** «Непераможаны». Дак. фільм.
**11.00** Весткі.
**11.30** «Нічога асабістага».
**11.45** Тэлевізійны мастацкі фільм «Ісаеў»
**13.20** «Гарадок». Дайджэст.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.20** Тэлесерыял «Вядзьмарскае каханне».
**15.10** Тэлесерыял «Тэрмінова ў нумар-2».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.25** «Гарадок». Дайджэст.
**17.55** Прэм'ера. «Карменіта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Прэм'ера. Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**20.30** Тэлевізійны мастацкі фільм «Ісаеў».
**22.35** Тэлесерыял «Вядзьмарскае каханне».
**23.30** Навіны - Беларусь.
**23.40** «Весткі+».
**00.00** «Формула Келдыша. Пралік галоўнага тээрэтыка». Дакументальны фільм.

### НТВ

**05.00** Канал «Сёння раніцай».
**07.45** Проста смачна.
**08.00** «Кулінарны паядынак».
**09.00, 12.00, 15.00, 18.00, 22.15** Сёння.
**09.20** «Сярэдні клас».
**10.15** Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне.
**11.00** Суд прысяжных.
**12.30** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**14.30** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**15.30** Серыял «Ліцэйны, 4».
**17.30** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**18.30** Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**20.30** Прэм'ера. Вострасюжэтны серыял «Час Волкава».
**21.30** Вочная стаўка.
**22.35** Прэм'ера. «Рука Масквы».
**23.35** Галоўная дарога.
**00.10** Камедыя «Трэці лішні» (ЗША).
**01.45** Вострасюжэтны фільм «Секунда да смерці» (ЗША).
**03.30** Вострасюжэтны фільм «Здымкі» (ЗША - Канада).

### EUROSPORT

**09.35** Вось дык так!!!
**09.45** Футбол. Чэмпіянат свету да 17 гадоў у Нігерыі. Групавы этап. Алжыр - Італія.
**10.45** Футбол. Чэмпіянат свету да 17 гадоў у Нігерыі. Групавы этап. Іспанія - ЗША.
**11.45** Футбол. Чэмпіянат свету да 17 гадоў у Нігерыі (Абуджа). Групавы этап. Уругвай - Паўднёвая Карэя.
**13.15** Футбол. Чэмпіянат свету да 17 гадоў у Нігерыі. Групавы этап. Алжыр - Італія.
**14.15** Футбол. Чэмпіянат свету да 17 гадоў у Нігерыі. Групавы этап. Іспанія - ЗША.
**15.15** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**16.00** Тэніс. Выніковы чэмпіянат WTA (Доха, Катар). Папярэдні этап. Прамая трансляцыя.
**19.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**19.10** Тэніс. Выніковы чэмпіянат WTA (Доха, Катар). Папярэдні этап. Прамая трансляцыя.
**21.15** Футбол. Чэмпіянат свету да 17 гадоў у Нігерыі (Абуджа). Групавы этап. Аргентына. Германія.
**23.00** Футбол. Чэмпіянат свету да 17 гадоў у Нігерыі (Абуджа). Групавы этап. Бразілія. Мексіка.
**00.00** Экстрэмальны спорт. «Freeride Spirit».
**00.15** Ралі. Чэмпіянат свету. «Ралі Вялікабрытаніі». Агляд.
**01.15** Аўтаспорт. Сусветная серыя «Рэно» у Іспаніі (Алканіз). Агляд.
**01.45** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**19.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.05** МакраФон: «Басовішча-2007», канцэрт гурта «Крама»: ч. 1.
**19.40** Тыдзень з радыё «Свабода».
**20.10** Акно ў Еўропу.
**20.40** Сальда (эканамічная праграма).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Давыд Гарадзенскі» (спазнаваўчая праграма).
**21.30** Невядомая Беларусь: «Беларусь пад нямецкай акупацыяй», дак. фільм, 2009 г., Польшча, ч. 3.
**22.20** Аўтастопам праз Еўропу, 7 серыя: Прага.
**22.35** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**22.50** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы.
**23.00** Аб'ектыў.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ



## 28 КАСТРЫЧНІКА, СЕРАДА

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.05, 08.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45, 07.45** Зона Х.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Сфера інтарэсаў.
**09.05** Ваенная драма «Застава Жыліна».
**09.55** Меладрама «Сёстры па крыві».
**10.50** Камедыйная меладрама «Не нарадзіся прыгожай» (Расія).
**11.35** «Алімпійскі часопіс».
**12.10** Фантастычны серыял «Зорны крэйсер «Галактыка» (ЗША - Вялікабрытанія).
**13.05** OFF STAGE LIFE».
**13.15** Дэтэктыўны серыял «Вероніка Марс-2» (ЗША).
**14.05** Альманах вандраванняў.
**14.30** Відэафільм АТН «Колас.Купала. Таямніцы біяграфіі». Частка 1-я.
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.25** Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
**15.55** Меладраматычны серыял «Сяброўка банкіра» (Расія). 2-я серыя.
**16.50** Меладрама «Сёстры па крыві».
**17.50** Камедыйная меладрама «Не нарадзіся прыгожай» (Расія).
**18.50, 01.35** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** «Зямельнае пытанне».
**19.50** Ваенная драма «Застава Жыліна».
**20.50** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**21.00** Панарама.
**21.50** Драматычны вострасюжэтны серыял «Часткі цела» (ЗША).
**22.55** «Эпоха». «Кшыштафу Занусі - 70» Фільм 1-ы.
**23.25** Дэтэктыўны трылер «Прэзумпцыя невінаватасці» (ЗША).
**01.45** Дзень спорту.

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Рудая». Шматсерыйны фільм.
**10.05** «Адмірал». Шматсерыйны фільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Дэтэктывы».
**11.50** «Ералаш».
**12.00** «Малахаў+».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.40** «Кантрольны закуп».
**15.15** «Яўлампія Раманава. Следства вядзе дылетант». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Монтэкрыста». Шматсер. фільм.
**17.10** «Хай кажуць».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Камедыйны серыял «Мая выдатная няня», 2004 год.
**18.55** «Рудая». Шматсерыйны фільм.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Галоўная прэм'ера года. «Адмірал». Шматсерыйны фільм.
**22.10** АНТ прадстаўляе: «Што? Дзе? Калі?» у Беларусі. Восеньская серыя гульняў.
**23.25** Нашы навіны.
**23.40** Навіны спорту.
**23.45** АНТ прадстаўляе: «Дакументальны дэтэктыў». «Успомніць усё...».
**00.20** «Жанатыя... з дзецьмі». Шматсерыйны фільм.
**00.30** «Звар'яцеў ад цябе». Шматсер. фільм.
**01.20** Нашы навіны.
**01.35** Навіны спорту.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Аўтапанарама».
**08.50** «Спецназ». Серыял.
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.45** «Званая вячэра».
**12.40** «Былая». Серыял.
**13.50** «Ваенная таямніца».
**14.40** «Гадкае качаня». Моладзевы серыял.
**15.30** «Мёртвы, жывы, небяспечны». Серыял.
**16.50** «Новыя падарожжы дылетанта».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Былая». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.20** «Добры вечар, маляня».
**20.30** «Дабро пажаліцца».
**20.55** «Мёртвы, жывы, небяспечны». Серыял.
**22.00** «Мінск і мінчане».
**22.55** «Сталічныя падрабязнасці».
**23.00** «Дэтэктыўныя гісторыі».
**23.55** «Спецназ». Серыял.

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Камедыйны серыял «Юрыкі» (Расія).
**08.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.30** У гэты дзень.
**09.35** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.30** Кінааповесць «Мой сябар Іван Лапшын» (СССР).
**12.15** Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**12.55** Спорт-кадр.
**13.25** Моладзевы серыял «Начныя агні пятніцы» (ЗША). 3-я серыя.
**14.10** Мультфільм.
**14.20** Мультсерыял «Русалачка» (ЗША).
**14.45** «Хачу ўсё ведаць». Кіначасопіс.
**14.55** Пазакласная гадзіна.
**15.10** «Лабірынты гісторыі беларускіх татараў». Частка 1-я.
**15.40** Медычныя таямніцы.
**16.05** Дэтэктыўны серыял «Камісар Мегрэ» (Францыя-Бельгія- Швейцарыя).
**16.55** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.10** Хакей. КХЛ. Дынама (Масква) - Дынама (Мінск). У перапынку: Калыханка.
**21.35** Беларуская часіна.
**22.35** Іншыя.
**23.05** Камедыйны серыял «Юрыкі» (Расія).
**23.45** Дэтэктыўны серыял «На рагу ў Патрыяршых-2» (Расія).
**00.40** Дэтэктыўны серыял «Камісар Мегрэ» (Францыя-Бельгія- Швейцарыя).

### РОССИЯ

**07.00** Добрай раніцы, Расія!.
**09.20** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**10.10** «Юльян Сямёнаў. Інфармацыя да разважання». Дакументальны фільм.
**11.00, 14.00, 17.00** Весткі.
**11.25** Тэлевізійны мастацкі фільм «Ісаеў»
**12.50** «Гарадок». Дайджэст.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.20** Тэлесерыял «Вядзьмарскае каханне».
**15.10** Тэлесерыял «Тэрмінова ў нумар-2».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.25** «Гарадок». Дайджэст.
**17.55** Прэм'ера. «Карменіта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**20.30** Тэлевізійны мастацкі фільм «Ісаеў».
**22.30** Тэлесерыял «Вядзьмарскае каханне».
**23.30** Навіны - Беларусь.
**23.40** «Весткі+».
**00.00** «Смяротная зброя. Лёс Макарава». Дакументальны фільм.
**00.55** Заканчэнне эфіру.

### НТВ

**05.00** Канал «Сёння раніцай».
**07.45** Проста смачна.
**08.00** Дачны адказ.
**09.00** Сёння.
**09.20** «Сярэдні клас».
**10.20** Асабліва небяспечны!
**11.00** Суд прысяжных.
**12.00** Сёння.
**12.30** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**14.30** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**15.00** Сёння.
**15.30** Серыял «Ліцейны, 4».
**17.30** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**18.00** Сёння.
**18.30** Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**20.30** Прэм'ера. Вострасюжэтны серыял «Час Волкава».
**21.30** І зноў добры дзень!
**22.15** Сёння.
**22.35** Баявік «Чырвоны скарпіён» (ЗША).
**01.10** Вострасюжэтны фільм «Дракула» (Вялікабрытанія).
**03.05** Баявік «Шэсць» (ЗША).

### EUROSPORT

**09.30** Экстрэмальны спорт. «Freeride Spirit».
**09.45** Вось дык так!!!
**10.00** Тэніс. Выніковы чэмпіянат WTA (Доха, Катар). Папярэдні этап.
**11.30** Футбол. Чэмпіянат свету да 17 гадоў у Нігерыі. Групавы этап. Нігерыя - Гандурас.
**12.30** Футбол. Чэмпіянат свету да 17 гадоў у Нігерыі (Абуджа). Групавы этап. Бразілія - Мексіка.
**13.30** Футбол. Чэмпіянат свету да 17 гадоў у Нігерыі (Абуджа). Групавы этап. Аргентына - Германія.
**15.00** Тэніс. Выніковы чэмпіянат WTA (Доха, Катар). Папярэдні этап. Прамая трансляцыя.
**16.00** Тэніс. Выніковы чэмпіянат WTA (Доха, Катар). Папярэдні этап.
**19.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**19.10** Тэніс. Выніковы чэмпіянат WTA (Доха, Катар). Папярэдні этап. Прамая трансляцыя.
**21.15** «Формула-1». Часопіс.
**21.55** Абранае па серадах.
**22.00** Абранае па серадах Госць тыдня.
**22.10** Навіны коннага спорту.
**22.15** Гольф. Тур PGA. «Frys.com Open».
**23.15** Гольф. Еўратур.
**23.45** Гольф-клуб.
**23.50** Ветразевы спорт. Medcup. Агляд.
**00.45** Яхт-клуб.
**01.00** «За чыстую планету». Часопіс.
**01.30** Ралі. Чэмпіянат свету. «Ралі Вялікабрытаніі». Агляд.
**01.20** Тэніс. Турнір WTA (Расія). Дзень 3.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**19.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.05** Праект «Будучыня».
**19.35** «Бульбаны», мультсерыял: «Скарб».
**19.45** Форум: «Веравызнанне ў Беларусі».
**20.35** Без рэтушы: «Алкаш», дак. фільм, 2009 г., Польшча.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Еўфрасіння Полацкая».
**21.30** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял.
**22.25** Сальда (эканамічная праграма).
**22.40** Аб'ектыў.

## 29 КАСТРЫЧНІКА, ЧАЦВЕР

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.05, 08.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45, 07.45** Зона Х.
**07.30, 08.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** «Зямельнае пытанне».
**09.05** Ваенная драма «Застава Жыліна».
**10.00** Меладрама «Сёстры па крыві».
**10.50** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**11.40** Відэафільм АТН «Сянно з блакітнымі вачыма» цыклу «Зямля беларуская».
**12.10** Фантастычны серыял «Зорны крэйсер «Галактыка» (ЗША - Вялікабрытанія).
**13.10** Серыял «Вероніка Марс-2» (ЗША).
**14.05** Уласнай персонай.
**14.30** Відэафільм АТН «Колас.Купала. Таямніцы біяграфіі». Частка 2-я.
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.25** Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
**15.55** Меладраматычны серыял «Сяброўка банкіра» (Расія). 3-я серыя.
**16.50** Меладрама «Сёстры па крыві».
**17.50** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**18.50, 01.15** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** Сфера інтарэсаў.
**19.55** Ваенная драма «Застава Жыліна».
**21.00** Панарама.
**21.50** Драматычны вострасюжэтны серыял «Часткі цела» (ЗША).
**22.55** «Эпоха». «Кшыштафу Занусі - 70» Фільм 2-і.
**23.25** Прыгодніцкі фільм «Галоўны калібр» (Расія).
**01.20** Дзень спорту.

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Рудая». Шматсерыйны фільм.
**10.05** «Адмірал». Шматсерыйны фільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Дэтэктывы».
**11.50** «Ералаш».
**12.00** «Малахаў+».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.40** «Кантрольны закуп».
**15.15** «Яўлампія Раманава. Следства вядзе дылетант». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Монтэкрыста». Шматсер. фільм.
**17.10** «Хай кажуць».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Серыял «Мая выдатная няня», 2004 г.
**18.55** «Рудая». Шматсерыйны фільм.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Галоўная прэм'ера года. «Адмірал». Шматсерыйны фільм.
**22.10** АНТ прадстаўляе: «Што? Дзе? Калі?» у Беларусі. Восеньская серыя гульняў.
**23.25** Нашы навіны.
**23.40** Навіны спорту.
**23.45** «Жанатыя... з дзецьмі». Шматсерыйны фільм.
**00.40** «Звар'яцеў ад цябе». Шматсер. фільм.
**01.30** Нашы навіны.
**01.45** Навіны спорту.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Дабро пажаліцца».
**08.50** «Спецназ». Серыял.
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.45** «Званая вячэра».
**12.40** «Былая». Серыял.
**13.30** «24 гадзіны».
**13.50** «Прыватныя гісторыі».
**14.40** «Гадкае качаня». Моладзевы серыял.
**15.30** «Мёртвы, жывы, небяспечны». Серыял.
**16.50** «Добры дзень, доктар!».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Былая». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.20** «Добры вечар, маляня».
**20.30** «Аўтапанарама».
**20.55** «Мёртвы, жывы, небяспечны». Серыял. Заключная серыя.
**22.00** «Асабісты інтарэс».
**22.55** «Сталічныя падрабязнасці».
**23.00** «Сакрэтныя гісторыі».
**23.55** «Спецназ». Серыял. Закл.серыя.

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Камедыйны серыял «Юрыкі» (Расія).
**08.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.30** У гэты дзень.
**09.35** Серыял «Каханне як каханне».
**10.30** Вострасюжэтны фільм «Бег ад смерці.
**11.55** «Палатно даўжынёй у жыццё». Дакументальны фільм (БТ).
**12.10** Экспедыцыя.
**12.40** Бітва экстрасэнсаў.
**13.30** Моладзевы серыял «Начныя агні пятніцы» (ЗША). 4-я серыя.
**14.15** Мультфільм.
**14.35** Мультсерыял «Русалачка» (ЗША).
**15.00** «Хачу ўсё ведаць». Кіначасопіс.
**15.10** Пазакласная гадзіна.
**15.25** Пасоўванне+.
**16.05** Дэтэктыўны серыял «Камісар Мегрэ» (Францыя-Бельгія- Швейцарыя).
**16.55** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**18.00** Серыял «Каханне як каханне».
**19.00** Крымінальная камедыя «Дэжа вю» (СССР-Польшча).
**21.20** Калыханка.
**21.35** Беларуская часіна.
**22.35** Час футболу.
**23.05** Камедыйны серыял «Юрыкі» (Расія).
**23.45** Дэтэктыўны серыял «На рагу ў Патрыяршых-2» (Расія).
**00.40** Дэтэктыўны серыял «Камісар Мегрэ» (Францыя-Бельгія- Швейцарыя).

### РОССИЯ

**07.00** Добрай раніцы, Расія!.
**09.20** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**10.10** «Гуд бай, Амерыка. Кампазітар Зацэпін». Дакументальны фільм.
**11.00** Весткі.
**11.25** Тэлевізійны мастацкі фільм «Ісаеў»
**13.05** «Гарадок». Дайджэст.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.20** Тэлесерыял «Вядзьмарскае каханне».
**15.10** Тэлесерыял «Тэрмінова ў нумар-2».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.25** «Гарадок». Дайджэст.
**17.55** Прэм'ера. «Карменіта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**20.30** Тэлевізійны мастацкі фільм «Ісаеў».
**22.30** Тэлесерыял «Вядзьмарскае каханне».
**23.30** Навіны - Беларусь.
**23.40** «Весткі+».
**00.00** «Чалавек з жыцця. Яўген Прымакоў». Дакументальны фільм.

### НТВ

**05.00** Канал «Сёння раніцай».
**07.45** Проста смачна.
**08.00** «Рука Масквы».
**09.00, 12.00, 15.00, 18.00, 22.15** Сёння.
**09.20** «Сярэдні клас».
**10.20** Чыстасардэчнае прызнанне.
**11.00** Суд прысяжных.
**12.30** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**14.30** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**15.30** Серыял «Ліцейны, 4».
**17.30** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**18.30** Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**20.30** Прэм'ера. Вострасюжэтны серыял «Час Волкава».
**21.30** Галоўны герой прадстаўляе.
**22.35** «Позняя гутарка».
**23.25** Авіятары.
**00.00** Баявік «Спецназ: аперацыя «Адплата» (ЗША).
**01.50** Камедыя.
**03.35** Вострасюжэтны фільм «Глабальная пагроза» (ЗША).

### EUROSPORT

**09.30** «За чыстую планету». Часопіс.
**10.00** Тэніс. Выніковы чэмпіянат WTA (Доха, Катар). Папярэдні этап.
**11.30** Футбол. Чэмпіянат свету да 17 гадоў у Нігерыі. Групавы этап. Іран - Калумбія.
**12.30** Футбол. Чэмпіянат свету да 17 гадоў у Нігерыі. Групавы этап. Турцыя - Коста-Рыка.
**13.30** Футбол. Чэмпіянат свету да 17 гадоў у Нігерыі. Групавы этап. Нідэрланды - Гамбія.
**15.00** Тэніс. Выніковы чэмпіянат WTA (Доха, Катар). Папярэдні этап.
**16.00** Тэніс. Выніковы чэмпіянат WTA (Доха). Папярэдні этап. Прамая трансляцыя.
**19.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**19.10** Тэніс. Выніковы чэмпіянат WTA (Доха, Катар). Папярэдні этап.
**21.15** Футбол. Чэмпіянат свету да 17 гадоў у Нігерыі. Групавы этап. ААЭ - Іспанія.
**23.00** Футбол. Чэмпіянат свету да 17 гадоў у Нігерыі (Абуджа). Групавы этап. Італія - Паўднёвая Карэя.
**00.30** Пра рэстлінг. «Vintage Collection». ЗША.
**01.30** Пра рэстлінг. Агляд WWE (World Wrestling Entertainment).
**02.00** Армрэстлінг. PAL/NAL.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**19.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.05** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял.
**19.35** МакраФон: канцэрт гурта «Ляпіс Трубяцкой» на цырымоніі ўручэння прэміі «Рок-каранацыя–2008».
**20.05** На колах.
**20.30** «Бульбаны», мультсерыял: «У лазні».
**20.45** Еўрапейскі Саюз без сакрэтаў, 17 серыя: «Еўрасаюз па-дацку».
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Ягайла» (спазнаваўчая праграма).
**21.35** «Афіцэр», дэтэктыўны серыял.
**22.30** Рэпартэр (публіцыстычна-інфармацыйная праграма).
**22.55** Аб'ектыў.

## 1 ЛІСТАПАДА, НАДЗЕЛЯ

### 1

**07.25** Анімацыйны прыгодніцкі фільм «Планета скарбаў» (ЗША).
**09.00, 12.00, 14.25, 19.00** Навіны.
**09.05** Арсенал.
**09.35** «Зброя». Цыкл дакументальных фільмаў (Беларусь).
**09.50** Альманах вандраванняў.
**10.15** Культурныя людзі.
**10.55** «У свеце матораў».
**11.30** «Nota Bene».
**12.10** Меладрама «Ваенна- палявы раман» (СССР).
**13.55** «Самураі на калясках». Відэафільм.
**14.35** Навіны рэгіёна.
**14.55** Чэмпіянат свету па аўтагонках «Формула-1». Гран-пры Бахрэйна. Гонка. Прамая трансляцыя.
**16.55** Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Відэачасопіс.
**17.25** «У чаканні Мундыаля». Дзённік чэмпіянату свету па футболе-2010.
**18.00** Суперлато.
**19.15** «OFF STAGE LIFE».
**19.30** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).
**20.35** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**21.00** «Панарама тыдня».
**22.10** «Зорныя танцы». «Жаночы сезон».
**23.40** Трылер «Дрэйф» (Германія).

### ОНТ

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь.
**09.20** Камедыйны серыял «Хто ў хаце гаспадар?», 2005 год.
**09.55** «Шалапутныя нататкі».
**10.15** Пакуль усе дома.
**11.05** Фазэнда.
**11.40** АНТ прадстаўляе: «Ранішняя пошта».
**12.15** «Разумніцы і разумнікі».
**13.00** АНТ прадстаўляе: «Зваротны адлік». «Палескі Vaterland».
**13.35** «Хачу ведаць».
**14.15** Нядзельны «Ералаш».
**14.30** Прэм'ера. «Мой радавод».
**15.25** «Песні Перамогі».
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** «Клуб Вясёлых і Знаходлівых». Вышэйшая ліга.
**18.45** АНТ прадстаўляе: «Бітва тытанаў».
**20.00** Контуры.
**21.05** АНТ прадстаўляе: «Што? Дзе? Калі?» у Беларусі. Восеньская серыя гульняў.
**22.20** «Здабытак Рэспублікі».

### СТВ

**06.40** «Дарагая перадача».
**07.05** «У нас усе дома». Камедыйны серыял.
**08.00** Фільм «Сёе-тое з губернскага жыцця». СССР, 1983 г.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** Відавочнік прадстаўляе: самае смешнае».
**10.55** «Вялікі сняданак».
**11.30** «Салдаты. Залатыя серыі».
**13.30** «Добры дзень, доктар!».
**14.00** «Прыватныя гісторыі».
**15.00** Фільм «Клуб самазабойцаў або прыгоды тытулаванай асобы прынца Флорызеля». СССР, 1979 г. 2-я серыя.
**16.15** «Рэальны спорт».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**17.20** Канцэрт М.Задорнава.
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень».
**20.40** Фільм «Давайце патанчым». ЗША, 2004 г.
**22.40** СТБ прадстаўляе: Новая калекцыя Валянціна Юдашкіна.
**00.20** «Прафесійны бокс».
**01.15** Фільм «Эйфарыя». 2006 г.

### ЛАД

**07.05** Мір вашай хаце.
**07.15** Дабравест.
**07.40** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.10** Рамантычная камедыя «Усё будзе добра» (Расія).
**10.05** Школа рамонту.
**11.05** Медычныя таямніцы.
**11.50** Бухта капітанаў.
**12.30** Прыгодніцкі анімацыйны фільм «Дабрыня Нікіціч і Змей Гарыныч» (Расія).
**13.50** Футбол. Чэмпіянат Беларусі. Гомель - Дынама (Мінск). Прамая трансляцыя.
**16.05** «Правы чалавека».
**16.20** Жаночая ліга.
**16.55** Хакей. КХЛ. Дынама (Мінск) - Дынама (Рыга). Прамая трансляцыя.
**19.15** «Зоркі гумару». Канцэртная праграма (Расія).
**20.00** Экспедыцыя.
**20.35** Тэлебарометр.
**20.55** Камедыя «Асаблівасці нацыянальнага палявання ў зімовы перыяд» (Расія).
**22.35** «Свая музыка. Працяг».
**23.05** Крымінальна-псіхалагічны трылер «Наркоз» (ЗША).

### РОССИЯ

**07.00** «Звычайны канцэрт з Эдуардам Эфіравым».
**07.30** Мультфільмы.
**07.50** Вострасюжэтны фільм «Казакі-разбойнікі». 2008 г.
**11.00** Весткі.
**11.15** «Сам сабе рэжысёр».
**12.10** «Храм дзяцінства Наталлі Дуравай».
**12.40** Фільм «Апошні жулік».
**14.00** Весткі.
**14.15** Тэлесерыял «Я шпік».
**15.15** Фільм «Не страляйце ў белых лебедзяў». 2-я серыя.
**16.30** Прэм'ера. «Песні кіно». Творчы вечар А.Зацэпіна.
**19.00** Весткі тыдня.
**20.05** «Сумленны дэтэктыў».
**20.40** Прэм'ера. Фільм «Ад турмы і ад торбы...». 2008 г.
**22.40** «Адмысловы карэспандэнт».
**23.50** Фільм «Жывая мішэнь».
**01.20** Заканчэнне эфіру.

### НТВ

**04.35** Дзіцячая раніца на НТБ. Мастацкі фільм «Мой сабака Скіп» (ЗША).
**06.05** Мультсерыял «Бэтмэн-2» (ЗША).
**06.30** «Дзікі свет».
**07.00** Сёння.
**07.20** Латарэя «Рускае лато».
**07.45** Іх норавы.
**08.25** Ямо дома.
**09.00** Сёння.
**09.20** Выратавальнікі.
**09.55** «Quattroruote». Праграма пра аўтамабілі.
**10.25** Барацьба за ўласнасць.
**11.00** Дачны адказ.
**12.00** Сёння.
**12.25** Баявік «Крымінальны квартэт».
**14.05** Свая гульня.
**15.00** Сёння.
**15.20** «Крамлёўская кухня».
**16.10** Дэтэктыўны серыял «Муж і жонка».
**18.00** «Сёння. Выніковая праграма».
**18.55** Чыстасардэчнае прызнанне.
**19.25** Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень.
**19.55** Прэм'ера. «Сеанс з Кашпіроўскім».
**20.45** Прэм'ера. Серыял «Шлюбны кантракт».
**22.30** Авіятары.
**23.05** Футбольная ноч.
**23.45** «Антытэрор».
**00.40** Баявік «Універсальны агент» (ЗША).
**02.30** Фільм «Хто баіцца Вірджыніі Вульф?».

### EUROSPORT

**06.00** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе «Турынг» (Акаяма, Японія). Warm-Up.
**06.30** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе «Турынг» (Акаяма, Японія). 1-я гонка. Прамая трансляцыя.
**07.30** Аўтаспорт. Азіяцкая серыя Ле Мана (Акаяма, Японія). 2-я гонка.
**08.45** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе «Турынг» (Акаяма, Японія). 2-я гонка. Прамая трансляцыя.
**09.45** Тэніс. Выніковы чэмпіянат WTA (Доха, Катар). Паўфінал.
**11.30** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе «Турынг» (Акаяма, Японія). 2-я гонка.
**12.30** «Формула-1». Часопіс.
**13.00** Аўтаспорт. Формула-2 у Іспаніі (Барселона). 2-я гонка. Прамая трансляцыя.
**14.00** Футбол. Чэмпіянат свету да 17 гадоў у Нігерыі (Абуджа). Групавы этап. Новая Зеландыя - Турцыя.
**15.00** Футбол. Чэмпіянат свету да 17 гадоў у Нігерыі (Абуджа). Групавы этап. Нідэрланды - Іран.
**16.00** Марафон. Нью-Йорк. Прамая трансляцыя.
**17.00** Тэніс. Выніковы чэмпіянат WTA (Доха, Катар). Фінал. Прамая трансляцыя.
**18.00** Марафон. Нью-Йорк. Прамая трансляцыя.
**18.05** Тэніс. Выніковы чэмпіянат WTA (Доха, Катар). Фінал. Прамая трансляцыя.
**19.00** «Марафон». Нью-Йорк.
**19.05** Футбол. Чэмпіянат свету да 17 гадоў у Нігерыі. Групавы этап. Малаві - Іспанія.
**20.00** Футбол. Чэмпіянат свету да 17 гадоў у Нігерыі (Абуджа). Групавы этап. Італія - Уругвай. Прамая трансляцыя.
**22.00** Футбол. Чэмпіянат свету да 17 гадоў у Нігерыі (Абуджа). Групавы этап. Паўднёвая Карэя - Алжыр. Абуджа (Нігерыя).
**23.00** Мотаспорт на выходных.
**23.15** Тэніс. Турнір ATP у Аўстрыі. Фінал.
**00.30** Тэніс. Турнір ATP у Расіі (Санкт-Пецярбург). Фінал.
**01.30** Тэніс. Выніковы чэмпіянат WTA (Доха, Катар). Фінал.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**19.05** «Аблавушак», мультсерыял.
**19.10** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**19.25** «Таямніца крэпасці шыфраў», тэлесерыял.
**20.10** Форум (ток-шоу): «Бацькі і дзеці».
**21.00** Аб'ектыў (вынікі тыдня).
**21.25** Акно ў Еўропу.
**22.00** Фільматэка майстроў: «Забытае святло», маст. фільм, 1996 г., Чэхія.

# ШАНОЎНЫЯ ЧЫТАЧЫ!

**Газета «Новы час» працягвае падпіску на 2009 год. Падпісацца на выданне можна на перыяд ад 1 месяца да 1 года праз пошту або праз банк.**

## Падпіска на «Новы час» праз пошту

1. Выразаем купон.
2. На ПАШТОВЫМ ПЕРАВОДЗЕ пішам суму грашовага пераводу ў лічбах і прапісам.
3. У графе «Ад каго» пішам прозвішча, імя, імя па бацьку.
4. Ніжэй указваем адрас.
5. Ідзем на бліжэйшае паштовае аддзяленне і здзяйсняем паштовы перавод.
6. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
7. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

Министерство связи и информатизации Республики Беларусь
№ ______ (по реестру ф. 11)
№ ______ (по реестру ф. 10)

ПРИЕМ

Предоплата за доставку г-ты "Новы час"

| Наименование предприятия связи, к - гербовая печать | Календарный шт. места подачи | № по ф. 5 | Сумма, вид услуги, подпись оператора |
|---|---|---|---|

ИСПРАВЛЕНИЯ НЕ ДОПУСКАЮТСЯ

ПОЧТОВЫЙ ПЕРЕВОД на ______________ руб.

______________ (сумма прописью)

Кому Куда: Г-та "Новы час", р/с 3012211080010 фил. МГДОАО "Белинвестбанк", код 153001764, УНН 190790926 г. Минск, ул. Коллекторная,11

От кого ______________

Адрес ______________ (почтовый индекс и подробный адрес)

## Падпіска на «Новы час» праз банк

1. Выразаем купон.
2. Пішам прозвішча, імя, імя па бацьку і адрас.
3. Указваем суму аплаты.
4. Ідзем у аддзяленне банка і здзяйсняем пералік грошай.
5. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
6. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

ИЗВЕЩЕНИЕ

ЧИУП «Час навінаў» (получатель платежа)
МГД ОАО «Белинвестбанк» г. Минск (наименование банка)
Счет получателя 3012211080010 Лицевой счет Код 764
УНП* 190790926
______________ (фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|

Период подписки указывает абонент
Плательщик
Пеня ______
Кассир Всего ______

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў» (получатель платежа)
МГД ОАО «Белинвестбанк» г. Минск (наименование банка)
Счет получателя 3012211080010 Лицевой счет Код 764
УНП* 190790926
______________ (фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|

Период подписки указывает абонент
Плательщик
Пеня ______
Кассир Всего ______

КІНО

# РЫМСКІ ПАПА ЖАНОЧАГА ПОЛУ

**19 кастрычніка ў Германіі адбылася прэм'ера фільма «Папа Яна». Галоўны герой — сярэднявечны Рымскі Папа Ян VIII, які, адпаведна легендзе, быў жанчынай.**









Жанчына быццам бы займала папскі прастол пад імем Ян VIII, паміж Львом IV (памёр у 855) і Бенедыктам III (памёр у 858). У прынятым у наш час спісе Рымскіх Папаў імя Ян VIII носіць Папа, які кіраваў крыху пазней — у 872–882 гадах.

Калі верыць гісторыкам, легенда пра жанчыну-Папу ўпершыню ў пісьмовым выглядзе з'явілася ў XIII стагоддзі. Па легендзе, Яна была дачкой англійскага місіянера. Нарадзілася ў Майнцы (Германія), адкуль у дванаццаць гадоў з манахам з манастыра Фульды сышла ў мужчынскай сукенцы ў манастыр на Афон. Пасля працяглых вандровак Яна пасялілася ў Рыме, дзе стала спачатку натарыусам курыі, затым кардыналам і, нарэшце, Папам Рымскім.

Праз некаторы час Яна стала цяжарнай. Падчас нейкай вулічнай працэсіі пачаліся роды, што яе і выдала. У гэтай гісторыі існуюць два фіналы: 1) Яна памерла адразу падчас родаў; 2) яе і дзіця адправілі ў розныя манастыры. Яе сын стаў біскупам, а сама Яна памерла.

Па той жа легендзе, зараз Рымскія Папы ў сваіх працэсіях быццам бы пазбягаюць дарогі, на якой нарадзіла Яна.

Прыхільнікі легенды таксама сцвярджаюць, што пасля гэтай гісторыі кожны новаабраны пантыфік да Льва X праходзіў працэдуру вызначэння полу з дапамогай спецыяльнага крэсла, вядомага як Sella.

Цікава, што легенда была папулярнай сярод саміх каталікоў. Рымская курыя доўгі час афіцыйна не адмаўлялася ад легенды пра Папу-жанчыну. Яе выява нават заняла месца сярод бюстаў, якія стаялі ў кафедральным саборы Сіены (Siena Cathedral).

Легенду актыўна эксплуатавалі праціўнікі каталіцкай царквы. Ян Гус, абараняючы сваю дактрыну перад Канстанцкім саборам, казаў: «Царква павінна быць бездакорнай, але ці можна лічыць бездакорным Папу Яна, што апынуўся жанчынай, якая публічна нарадзіла дзіця?» Німодны з 22 кардыналаў, 49 біскупаў і 272 багасловаў, якія прысутнічалі на Канстанцкім саборы, не пратэставаў супраць падобнага тэзісу, пацвердзіўшы сваім маўчаннем існаванне гэтай легендарнай асобы.

Сучасныя гісторыкі прапануюць некалькі тэорый пра паходжанне легенды. Штуршком для яе магла стаць анархія ў Святым горадзе ў VIII стагоддзі. Бертран Расэл у «Гісторыі заходняй філасофіі» даказвае, што ў аснову легенды лягла гісторыя Марацыі, дачкі рымскага сенатара з роду графаў Тускулума, якія з'яўляліся на пачатку X стагоддзя найбольш уплывовымі рымскімі арыстакратамі. Марацыя змяніла некалькіх мужоў і невядомую колькасць каханкаў. Аднаго з іх яна зрабіла Папам пад імем Сергія II (904–911). Сын яе ад гэтай сувязі быў Папам Янам XI (931–936). Яе ўнук — Ян XII (955–964) — стаў Папам Рымскім у 16-гадовым узросце і сваім жыццём канчаткова падарваў аўтарытэт царквы. Легенда, такім чынам, паўстала, верагодна, у насмешку з перыяду панавання жанчын пры папскім двары.

Іншыя гісторыкі лічаць, што міф узнік на базе анекдотаў на Папу Яна (872–882). Сучаснікі выстаўлялі яго жанчынай за мяккую і непаслядоўную палітыку супраць канкурэнтаў.

Цікавую версію прапануе гісторык Міхаэль Хеземан. Ён раскапаў, што да X стагоддзя ў Рыме сапраўды жыла папеса (vicus Papessa) — жанчына, якая брала ўдзел у розных рытуалах. Гэта быў перажытак паганскіх часоў (а менавіта культу Мітры).

Нарэшце, легенду маглі прыдумаць у тым жа Канстанцінопалі як кампрамат на Рым. Адзін з Рымскіх Папаў таго часу з агідай згадвае, што на берагах Басфору былі папулярныя чуткі пра тое, што ў Ватыкане бачылі еўнухаў, а кіруе каталіцкім храмам жанчына.

Але гістарычная праўда перамагла. Ніякага Папы-жанчыны на 99,99% не было. Але нягледзячы на ўсе намаганні вучоных, пры ўсёй відавочнай супярэчнасці легенды, гісторыя пра Папу Яну жыве. Праўда, на старонках літаратурных твораў і ў кінастужках.

Напрыклад, Аляксандр Пушкін у 1835 годзе рабіў накіды сюжэту да п'есы «Папеса Яна». Рэалізаваць праект не дазволіла дуэль з Дантэсам.

Апошнім, хто ўдала эксплуатаваў гэту тэму, аказалася амерыканская пісьменніца Донна Вулфалк Крос. Пару гадоў таму яна выдала кніжку «Папа Яна», па матывах якой і створаны сцэнар згаданага фільма.

Пісьменніца перапрацавала легенду і надала ёй суперфемініцкае гучанне. У кнізе распавядаецца пра маладую разумную жанчыну, якая, трапіўшы ў патрыярхальную абстаноўку, разумее: каб рэалізаваць сябе як асоба, трэба выглядаць як мужчына. У выніку яна настолькі ўваходзіць у ролю, што дасягае самых высокіх пасадаў.

Яна, паводле Вулфолк, — дачка сельскага служкі з Саксоніі. У яе ёсць брат — яе кумір, які вучыць чытаць, пісаць і г. д. Пастухова Яна пачынае капіраваць яго мужчынскія паводзіны. Гэта дазваляе ёй пазней пад імем брата Яна паступіць на вучобу да аднаго грэчаскага манаха. Тут пісьменніца дала волю фантазіі: перад тым, як паехаць у Рым, дзяўчына пачынае праяўляць пачуцці да нейкага манаха. Пасля на манастыр нападаюць вікінгі. Усіх забіваюць, акрамя, натуральна, гераіні і яе каханага.

Аднак на гэтым прыгоды Яны толькі пачынаюцца. Ужо будучы Папам, падчас навадnення Яна сустракаецца ў закінутым доме — згадайце з кім? — з тым самым манахам. Менавіта ад яго Яна становіцца цяжарнай. Самога бацьку, праўда, хутка забіваюць нейкія ворагі. Яна спрабуе зрабіць аборт, аднак без поспеху. У выніку Папа паміраe: калі пачынаюцца роды, ніхто не прыходзіць ёй на дапамогу.

Кніга адразу стала бестселерам і натхніла прадзюсераў на экранізацыю.

Фільм яшчэ толькі пабачыў свет, а гісторыкі не пакінулі ад яго каменя на камні. На іх думку, вобраз сярэднявечнай феміністкі — папросту лухта, не кажучы пра шматлікія гістарычныя неадпаведнасці.

Праўда, стваральнікаў стужкі гэта мала цікавіць. Пасля поспеху фільма «Код да Вінчы» жанр гістарычнага кіно, у якім пад сумнеў ставяцца рэлігійныя каноны, застаецца вельмі запатрабаваным гледачом. Існавала Яна ці не — не вельмі важна. Галоўнае — карціне гарантавана скандальная вядомасць.

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Еўропа і Беларусь адчуваюць патрэбу ў сяброўстве па важных практычных праблемах. Беларусь павінна інтэгравацца ў Еўропу, каб забяспечыць развіццё эканомікі і гарантаваць сацыяльную стабільнасць. Еўропа ж мае патрэбу ў Беларусі з-за яе геапалітычнага становішча, якое робіць Беларусь важным энергетычным партнёрам — 20 працэнтаў паставак расійскага газу ў Еўропу праходзіць праз Беларусь — і важным партнёрам у барацьбе з нелегальным гандлем і міграцыяй. Па гэтых прычынах больш цесныя сувязі паміж Еўропай і Беларуссю таксама адпавядаюць інтарэсам Расіі. Незалежная і стабільная Беларусь не можа і не павінна ўспрымацца як выклік Расіі.

**«European Voice» (Бельгія)**

Пад дамовай пра стварэнне КСАР пакуль не паставілі подпісы Узбекістан, у якога ёсць шэраг сумневаў на гэты конт, і Беларусь. Праўда, яшчэ ў канцы жніўня Лукашэнка заявіў, што Мінск не адмаўляўся ад удзелу ў фармаванні Калектыўных сіл аператыўнага рэагавання АДКБ. Так ці інакш, кіраўнікі Беларусі і Узбекістана цяперашнія вучэнні праігнаравалі. Верагодна, каб крыху змякчыць ураджанне ад свайго дэмаршу, Мінск даслаў двух назіральнікаў, што мала адбілася на працэсе абвастрэння расійска-беларускіх адносін. За некалькі дзён да пачатку манеўраў Лукашэнка ў чарговы раз рэзка раскрытыкаваў расійскі бок, абвінаваціўшы яго ў зрыве працэсу фармавання Саюзнай дзяржавы і ў распачынанні «газавай вайны». У адказ Масква прыстрашыла замарозіць 500-мільённы крэдыт, пра выдачу якога бакі ўжо дамовіліся.

**«Новая политика» (Казахстан)**

Чым выклікана адмова ад рашэння ўступаць у СГА (Сусветную гандлёвую арганізацыю) у рамках Мытнага саюзу, пакуль не ясна. Магчыма, непаслядоўнасць Лукашэнкі і, па меркаванні Аляксея Кудрына, незразумелыя перспектывы беларускай эканомікі, а таксама малазразумелыя дзеянні Мінску ў АДКБ прывялі Маскву і Астану, блізкіх да ўступлення ў СГА, да рашэння адмовіцца ад сумеснага з беларусамі праекту. Аднак афіцыйна заяўлена, што Расія будзе аказваць падтрымку Беларусі і Казахстану ва ўступленні ў СГА. Відавочна толькі, што ў Маскве вельмі незадаволеныя паводзінамі Лукашэнкі і, магчыма, новая тактыка па ўступленні ў СГА з'яўляецца папярэджаннем для беларускіх уладаў: трыванне Крамля не бязмежнае. Варта адзначыць, што сумеснае ўступленне ў СГА — далёка не першая постсавецкая ініцыятыва, якой афіцыйны Мінск устаўляе палкі ў колы ў надзеі аказаць ціск на Расію і атрымаць крэдыты ці зніжкі на энерганосьбіты. Адзначаныя вышэй моманты ў чарговы раз ставяць пытанне пра сапраўдныя мэты Беларусі пры ўдзеле ў розных міжнародных ініцыятывах на постсавецкай прасторы.

**«Сегодня» (Расія)**

Незалежныя эксперты сцвярджаюць, што ўвага дзяржавы да чарнобыльскай праблемы ў Беларусі паступова знікае. Згасанне чарнобыльскай праблематыкі звязана з палітычным рашэннем уладаў наконт будаўніцтва ў Беларусі першай атамнай электрастанцыі. Атрымліваецца, што адсутнасць чарнобыльскай праблемы можа дапамагчы дзяржаве вырашыць іншую праблему — энергетычную. І ў гэтай сувязі пра Чарнобыль намагаюцца не казаць.

**«Deutche Welle» (Германія)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### ПОЛЬШЧА. ДЛЯ АХВЯРАЎ КРЫЗІСУ ФУТБОЛ БУДЗЕ ТАННЕЙ

З незвычайнай ініцыятывай выступіла кіраўніцтва варшаўскага клубу «Polonia». З 17 кастрычніка тыя, хто мае даведкі аб рэгістрацыі ў службе працаўладкавання, могуць праходзіць на стадыён усяго за адзін злоты (адна тысяча беларускіх рублёў). На сайце клубу аўтары ідэі пішуць, што хацелі б такім чынам прыпыніць сацыяльны распад грамадства ў часы крызісу. Па іх словах, людзі, якія губляюць працу, вельмі часта трапляюць у дэпрэсію. Адчуванне сябе часткай калектыву — хаця б на стадыёне — псіхалагічна падтрымае ахвяр цяперашняга эканамічнага спаду. Пры гэтым было адзначана, што клуб не прыпыніць такую практыку сацыяльнай філантропіі і пасля заканчэння рэцэсіі. Разам з беспрацоўнымі танна наведваць стадыён змогуць жанчыны, дзеці да васьмі гадоў і людзі, якім споўнілася 65 гадоў.

**Па матэрыялах «Gazeta Wyborcza» (Польшча)**

### ІСПАНІЯ. СВЯТА Ў ГОНАР ЗАСНАВАЛЬНІКА КАТАЛОНСКАГА НАЦЫЯНАЛІЗМУ

Прыхільнікі каталонскай незалежнасці заклалі традыцыю новага свята. Цяпер штогод 5 кастрычніка яны будуць святкаваць дзень нараджэння Луіса Кампаніса, першага прэзідэнта аўтаномнай каталонскай рэспублікі (яна існавала да падзення іспанскай рэспублікі з 1934 па 1940 год). Луіс Кампаніс нарадзіўся ў 1882 годзе і быў забіты франкістамі за тое, што сярод іншага публічна спяваў каталонскі нацыянальны гімн. У рукі франкістаў яго перадала Гестапа пасля таго, як ўвесну 1940 года фашысты захапілі Парыж, дзе знаходзіўся каталонскі ўрад у эміграцыі. Апошнімі словамі Луіса былі: «За Каталонію!» Паколькі Кампаніс быў сябрам партыі Каталонскія левыя рэспубліканцы (ERC), няма нічога дзіўнага ў тым, што менавіта сябры ERC, якая існуе і да гэтага часу, прысутнічалі на свяце. Іх было каля 200 чалавек. Натуральна, выступоўцы ў сваіх прамовах галоўным чынам патрабавалі незалежнасці для краю. У акцыі, дарэчы, узяў удзел прэзідэнт футбольнага клуба «Barcelona».

**Па матэрыялах «Lewica» (Польшча)**

### ГЕРМАНІЯ. НЕЗВЫЧАЙНАЯ ПРАПАНОВА



Азіл Месут — 20-гадовы ігрок нямецкай зборнай па футболу, этнічны турак, выступіў з незвычайнай прапановай — уставіць у тэкст нацыянальнага гімна ФРГ фрагменты вершаў з Карану. Сваю ідэю ён матываваў тым, што падчас праслухоўвання нямецкага гімну перад матчамі зборная ФРГ не атрымлівае добрых пачуццяў. А вось калі б, на яго меркаванне, у песні былі словы з Карану, яго тонус быў бы больш пазітыўным. Нямецкая прэса, акрамя правардыкальных выданняў, пакуль не каментуе словы Месута. Магчыма, журналісты вырашылі не крыўдзіць вельмі таленавітага футбаліста, які забіў гол у апошнім матчы за заборную. Губляць такі талент напярэдадні чэмпіянат свету ў Паўднёвай Афрыцы было б глупствам. Што да нямецкага гімну, то яго ўжо раней перараблялі. Як вядома, пасля другой сусветнай вайны з тэксту былі прыбраныя словы «Deuthland, Deutchland ueber alees» («Германія, Германія вышэй за ўсё»). Так, што месца, сапраўды, вакантнае.

**Па матэрыялах «Junge Freiheit» (Германія)**




### ФРАНЦЫЯ. ПАДРУЧНІК ДЛЯ БУДУЧЫХ ПРЭЗІДЭНТАЎ

Былы прэзідэнт Францыі Жак Шырак, калі выступаў на адным з каналаў радыё, нечакана прызнаўся, што яго самая любімая кніга — «Прыгоды слаўнага жаўнера Швейка» Яраслава Гашэка. Навіна выклікала радасць і гора. Чэхі ганарацца, што кніга іхняга земляка стала настольнай для вядомага палітыка. Між тым, французскае грамадства палічыла заяву Шырака антыпатрыятычнай. Няўжо Гашэк пісаў лепш за Гюго, Пруста і Флабэра? — задае пытанне інтэлігенцыя. Журналісты спрабуюць знайсці, што агульнага ў чэшскага салдата і французскага рэспубліканца. Крытыкі сцвярджаюць, што Шырака і Швейка відавочна аб'ядноўвае любоў да піва. Вядома, што Шырак з'яўляецца заўзятым фанатам піўной маркі «Corona». Акрамя таго, як і Швейк, Шырак у юнацтве выпадкова быў прызнаны шпіёнам і ледзь не патрапіў за краты. Чэшская прэса, між тым, піша, што «Прыгоды слаўнага жаўнера Швейка» — гэта цудоўная энцыклапедыя чалавечых характараў, іх паводзін і амбіцый. Як сцвярджае чэшскае літаратурнае выданне «Respect», веданне твору Гашэка відавочна дапамагло маладому Шыраку зразумець, што абяцаць людзям. Гэта ў выніку і зрабіла яго прэзідэнтам.

**Па матэрыялах «Respect» (Чэхія)**

ЕЎРАСАЮЗ

# ГАРАНТ ЛІСАБОНСКАЙ КАНСТЫТУЦЫІ

*Алег ПЯТРОЎ*

**Пасля рэферэндуму ў Ірландыі, нефармальнай згоды з боку чэхаў і падпісання палякамі, так званы Лісабонскі праект Канстытуцыі Еўрасаюза можна лічыць фактычна прынятым. Адпаведна дакументу, у ЕС уводзяцца дзве новыя пасады: прэзідэнт і кіраўнік МЗС.**



Прэзідэнт будзе абірацца Саветам Еўропы на 2,5 гады. Міністр замежных спраў ЕС — на 5 год. Прычыны ўвядзення дзвюх новых пасад зразумелыя. ЕС павінна больш выразна вызначыць сябе на міжнароднай арэне.

У абавязкі прэзідэнта будзе ўваходзіць старшынства ў Савеце Еўропы (тут засядаюць прэм'еры краін ЕС) і прадстаўленне ЕС падчас рознага кшталту знешнепалітычных кантактаў.

На першы погляд, гэта выключна прадстаўнічыя функцыі, аднак спецыялісты, якія ведаюць брусельскую кухню, сцвярджаюць: калі прэзідэнтам ЕС стане харызматычная і валявая асоба, ЕС можа ператварыцца ў больш кансалідаванае аб'яднанне, нова планетнага лідэра.

Тым больш, калі пад рукой — міністр замежных спраў ЕС. Ён будзе мець свой дыпламатычны корпус і 8 мільярдаў еўра бюджэту штогод.

Дэфіцыт яскравых палітыкаў у Еўропе відавочны. Лепшы прыклад таму — цяперашні старшыня еўрапейскай камісіі Хасэ Мануэль Барозу, пераабраны на другі тэрмін. Яго фігура ў вачах еўрафілаў вельмі супярэчлівая: ён намагаецца не канфліктаваць з урадамі вялікіх дзяржаў, напрыклад, Германіі і Францыі, заложнікам чаго стала развіццё ўнутранага рынку ЕС. Партугалец таксама засвяціўся ў скандале з так званымі турмамі ЦРУ, у якіх без санкцый утрымліваліся грамадзяне ў тым ліку і краін ЕС.

Тым не менш, як не дзіўна, той жа Барозу мае шансы стаць прэзідэнтам ЕС. Аналітыкі кажуць, што Барозу можа паспрабаваць зрабіць сабе імідж больш аўтаномнага і паслядоўнага еўрапалітыка. І на гэты раз у яго камандзе галоўным чынам блізкія яму па поглядах кансерватары.

Другім і пакуль галоўным кандыдатам на пасаду кіраўніка ЕС выступае 56-гадовы Тоні Блэр, былы прэм'ер Вялікабрытаніі ад Партыі лейбарыстаў. Яшчэ задоўга да плебісцыту ў Ірландыі, ён пачаў публічна казаць пра жаданне заняць крэсла першага прэзідэнта ЕС. Ягоныя плюсы: паслядоўны рыначнік (гэта падабаецца кансерватарам, якія апошнім часам маюць у Еўрапарламенце большасць), вопыт працы на пасадзе кіраўніка адміністрацыі, стратэгічнае мысленне. Акрамя таго, Блэр карыстаецца падтрымкай палітычных эліт Парыжу і Берліну.

Мінус Блэра — вайна ў Іраку. Крытыкі кажуць, што Блэр можа гэтак жа лёгка зацягнуць ЕС у нейкую іншую геапалітычную авантуру.

Наступны пасля Блэра — 53-гадовы Ян Петэр Балкененд, цяперашні прэм'ер Нідэрландаў. Яго лічаць экспертам у дасягненні кампрамісаў. Ён ведае, як працаваць з левымі і правымі. Адмоўны бок — відавочны брак харызмы і адсутнасць глабальнага бачання і вялікіх амбіцый.

Добрыя магчымасці мае Жан-Клод Юнкер — прэм'ер-міністр Люксембургу. Лічыцца, што ён здольны абараняць правы малых дзяржаў і пры гэтым — заўзяты прыхільнік еўраінтэграцыі.

Хто далей? Гэта былы фінскі прэм'ер Паава Ліппанен. Фін належыць да лагеру рэфармісцкіх левых. На пасадзе кіраўніка дзяржавы зарэкамендаваў сябе як паслядоўны прыхільнік інтэграцыі. Яго адносяць да галоўных пратэжэ Ангелы Меркель. Але фінскага палітыка не любяць у Варшаве і некаторых краінах Усходняй Еўропы. На думку палякаў, ён залішне любіць Расію.

У сваю чаргу, Варшава, здаецца, хацела б бачыць ў крэсле прэзідэнта ЕС Карла Більдта, цяперашняга міністра замежных спраў Швецыі. Гэты скандынаў заўсёды жорстка ставіўся да курсу Масквы на адраджэнне шматпалярнага свету.

Більдт таксама выступае за далейшае пашырэнне ЕС на ўсход і ўключэнне ў яго склад Турцыі. Апошняя акалічнасць памяншае ягоныя шансы, паколькі турэцкае сяброўства ў ЕС не выклікае захаплення ў ФРГ і Францыі.

Хаця шмат хто лічыць, што Більдт у выпадку, калі Блэр стане прэзідэнтам, мог бы заняць пасаду кіраўніка еўрапейскага МЗС. Більдт і Блэр лічацца сябрамі.

Дарэчы, ахвотных на пасаду кіраўніка еўрапейскай дыпламатыі таксама хапае. Гэта Оллі Рэн, цяперашні камісар па пытаннях пашырэння ЕС. Ягоныя галоўныя канкурэнты — былы міністр замежных спраў Германіі Франк-Вальтэр Штайнмаер і аўстрыйка Урсула Пласснік.

Нарэшце, пералічым палітыкаў, якія так ці інакш давалі зразумець, што хацелі б стаць прэзідэнтам ЕС. Гэта Берці Ахерн, прэм'ер Ірландыі, Вацлаў Гавэл, былы прэзідэнт Чэхіі, італьянскі правы палітык, былы прыхільнік Мусаліні Джанфранка Фіні. Былы прэм'ер Іспаніі Хасэ Марыя Азнар, і нават былы кіраўнік ураду Балгарыі.

**Абранне лідэра ЕС і дырэктара яго МЗС стане не проста фармальным. Гэта будзе вялікая камбінацыя, дзе разменныя пешкі — партфелі Еўрапейскай камісіі. Кожная краіна хацела б працягнуць свайго чалавека на тую ці іншую пасаду**

Абранне лідэра ЕС і дырэктара яго МЗС стане не проста фармальным галасаваннем па кандыдатурах. Гэта будзе вялікая камбінацыя, дзе разменныя пешкі — партфелі камісараў Еўрапейскай камісіі. Кожная краіна хацела б працягнуць свайго чалавека на тую ці іншую пасаду ў гэтай структуры. Так, Францыя хацела б захаваць свае пратэкцыянісцкія прывілеі. Не выключана, што яна пагодзіцца падтрымаць кандыдатуру якога-небудзь палітыка ў абмен на пасаду міністра ўнутранага рынку.

У любым выпадку, як пішуць каментатары, Еўропа мае, магчыма, унікальны шанс. Першы гарант Лісабонскай канстытуцыі атрымае карт-бланш. Яго кадэнцыя прыпадае ў час выхаду сусветнай эканомікі з крызісу, і Еўропа ў выпадку мабілізацыі сваіх рэсурсаў у імя адзінай мэты можа стаць глабальным лідэрам, як ЗША і Кітай.

ВЫБАРЫ

# ВАЙНА КАМПРАМАТУ

**Афіцыйны старт прэзідэнцкай выбарчай кампаніі ва Украіне адбыўся сінхронна з пачаткам самага гучнага сексуальнага скандалу. Як ён можа адбіцца на выніках будучых выбараў? Пра гэта і пра іншыя аспекты ўкраінскай палітыкі журналіст «НЧ» Алег Новікаў размаўляе з украінскім палітолагам Юрыем Дакукіным.**




***— Некалькі дэпутатаў Блоку Юліі Цімашэнка (БЮТ) абвінавачаныя ў згвалтаванні дзяцей. Распавядзіце, калі ласка, у двух словах, што адбылося.***

— Скандал пачаўся пасля выступу дэпутата ад «Партыі рэгіёнаў» Вадзіма Калеснічэнкі. Па яго словах, у міжнародным дзіцячым лагеры «Артэк» гвалтавалі дзяцей. Быццам да яго «звярнулася Алена Палюховіч, маці дваіх дзяцей, якія былі згвалтаваныя ў «Артэку». У якасці гвалтаўнікоў фігуравалі не вельмі вядомыя (акрамя дырэктара лагера) публіцы тэхнічныя супрацоўнікі плюс былы муж Алены. Палітычны скандал выклікаў наступныя выказванні Алены: «Я ведаю, што мой былы муж (ён быў арыштаваны як абвінавачаны) распавядаў у камеры пра ўсіх удзельнікаў оргій, называў прозвішчы і сумы, якія ён атрымліваў, прадаючы ўласных дзяцей. Я ведаю, што ён таксама распавядае пра оргіі народнага дэпутата Віктара Уколава (фракцыя БЮТ) і з іншымі дзецьмі». Такую інфармацыю жанчына быццам атрымала ад крымінальных аўтарытэтаў. Пасля гэтага, па словах Калеснічэнкі, маці пацярпелых надрукавала з сайта Вярхоўнай Рады фота ўсіх дэпутатаў і паказала іх сыну. На іх хлопчык нібыта пазнаў не толькі Уколава, аднак і іншых сяброў фракцыі БЮТ — Цярохіна і Багдана. Быццам менавіта яны гвалтавалі яго ў Кіеве на кватэры, куды прыводзіў сына бацька, былы муж Зміцер Палюховіч (апошні са жніўня знаходзіцца ў турме як абвінавачаны ў згвалтаванні сваіх дзяцей).

***— Ці можна верыць усяму гэтаму?***

— Пералічу аргументы за і супраць. Ёсць дадзеныя двух медыцынскіх аглядаў і экспертызы, якія пацвярджаюць, што двое дзяцей з сям'і Палюховіч маглі падвяргацца сексуальнаму гвалту. Прычым гвалт мог адбывацца на працягу трох гадоў. Гэта значыць, калі хлопчыку было дзевяць, а дзяўчынцы — шэсць гадоў.

Аргументаў "супраць" пакуль больш. Перш за ўсё, тое, што была раскрытая таямніца следства і парушана прэзумпцыя невінаватасці. Да таго ж маці дзяцей на працягу трох гадоў не магла не звярнуць увагу на тое, што адбывацца. Варта падкрэсліць адну дэталь: на першых допытах пацярпелых дзяцей няма ніводнага ўказання на народных дэпутатаў. Па словах Алены, сляды нардэпаў з'явіліся пазней — на падставе фактаў, якія ёй нібы распавялі крымінальныя аўтарытэты. Асобы, якія быццам гвалцілі людзей у Артэку, належаць да абсалютна розных сацыяльных груп, адзін з іх нават не жыве ва Украіне. Між тым, барацьба за «Артэк» сапраўды не з'яўляецца сакрэтам. Размова пра 209 гектараў дарагой крымскай зямлі. Дарэчы, падчас цяперашняга скандалу міністр Луцэнка заявіў, што, быццам, скандал пацвердзіў неабходнасць вывядзення «Артэка» з-пад кантролю прэзідэнта.

***— Ці можа скандал адбіцца на рэйтынгу БЮТ?***

— На рэйтынгу Блока Цімашэнка скандал у «Артэку» не адаб'ецца. У першую чаргу, таму што большасць яе выбарцаў — гэта цвёрдае ядро, якое пры з'яўленні любой новай інфармацыі, нават кампрамату, меркаванне пра яе мяняць не збіраецца. Пра гэта сведчыць справа дэпутата Лазінскага, які практыкаваў у прыватным запаведніку паляванне на бамжоў. Электарат Юліі такім не цікавіцца.

***— Якой была рэакцыя БЮТ на абвінавачанні?***

— Дастаткова не лагічная і істэрычная. Блізкія да БЮТ СМІ заклікалі журналістаў прыняць этычную хартыю, сэнс якой — не капацца ў бялізне палітыкаў. Быццам гэта дапаможа захаваць імідж Украіны ў свеце. Прапанова смешная, асабліва з улікам таго, што літаральна ў той жа дзень адзін з дэпутатаў фракцыі БЮТ прапанаваў перагледзець справу Януковіча. У 1970-я гады лідэр «Партыі рэгіёнаў» сядзеў за спробу згвалтавання. Дэпутат сцвярджае, што пасля выхаду з турмы ён заняўся старым — зноў арганізаваў згвалтаванне, цяпер ужо групавое. Аднак неяк адмазаўся.

***— Наколькі папулярныя кандыдаты на момант старту кампаніі?***

— Пакуль што ўсё кажа пра перамогу Януковіча. Аднак гэта ўжо не той Януковіч, які быў 5 гадоў таму. Перш за ўсё, таму, што Масква больш асцярожна ўдзельнічае ў выбарах. Выкарыстоўваючы міжпартыйную дыпламатыю, адміністрацыя расійскага прэзідэнта, відавочна, дэманструе сваю сімпатыю Віктару Януковічу, аднак пры гэтым не робіць на яго ўжо аднача стаўкі, як у 2004 годзе.

***— У выпадку перамогі Януковіча, ці варта чакаць ідэйнай рэвізіі спадчыны Майдана?***

— «Партыя рэгіёнаў» спрабуе гэта рабіць ужо зараз. Яна актыўна прасоўвае тэзіс пра тое, што Майдан — гэта знак перасцярогі перад палітыкамі-папулістамі. Маўляў, Майдан арганізавалі тыя, каго выгнаў Кучма. І выгнаў іх Кучма не за палітыку, а за нямэтавае выкарыстанне крэдытаў МВФ і штучнае незаконнае банкруцтва банкаў сабе ў кішэню. За няўменне кіраваць на любым узроўні і за карысталюбства на любой пасадзе. Аднак наўрад ці такая трактоўка будзе прынятая грамадствам. Майдан — вельмі важная эмацыйная частка жыцця шмат каго. Папросту зараз большасць разумее тое стаянне на плошчы не як барацьбу за аранжавую каманду, а за фундаментальныя грамадзянскія правы. Дарэчы, як не дзіўна, без Майдану ўкраінцы не мелі б шансаў на тое, каб злачынцы сапраўды селі ў турму. Пацвердзіць любую з версій па справе педафілаў можа толькі следства і суд. Але хоць нейкі шанец на гэта ёсць толькі пры ўмове публічнасці суда і свабоды прэсы.

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### ФІДЭЛЬ КАСТРА



Лідэр кубінскай рэвалюцыі, які адышоў ад кіраўніцтва па стану здароўя, тым не менш застаўся ў вялікай палітыцы дзякуючы калонцы ў газеце кампартыі «Granma». Часам Фідэль выдае тут вельмі арыгінальныя рэчы. Так, у нумары за 15 кастрычніка Кастра прайшоўся па Абаме, які атрымаў Нобелеўскую прэмію міру, і ўвогуле па схеме вызначэння лаўрэату. На яго думку, куды больш правоў на прэмію мае прэзідэнт Балівіі Эва Маралес, за тое, што радыкальна на ўзроўні канстытуцыі пашырыў правы індзейцаў, фактычна зламаўшы тым самым сістэму, якая існавала ў краіне з часоў іспанскага каланіялізму. Акрамя таго, ён увёў у краіне для ўсіх дзяцей бясплатную адукацыі. Нарэшце, Эва асмеліўся нацыяналізаваць газавыя кампаніі. Кастра ўпэўнены, што рэформы Маралеса выклікаюць рэвалюцыйныя працэсы па ўсяму кантыненту. Абама, як лічыць Кастра, на такія радыкальныя рэформы аказаўся не гатовы. Акрамя таго, менавіта адміністрацыя Абамы абвастрыла канфлікт у Афганістане. Увогуле, Кастра прапанаваў, каб выбары лаўрэата нобелеўскай прэміі міра праходзілі адкрыта ў выглядзе своеасаблівага сусветнага галасавання, напрыклад, sms.

### АРНАЛЬДА АРТЭГІ




Лідэр забароненай партыі «Батасуна», якая выступае за стварэнне незалежнай баскскай дзяржавы і падтрымлівае кантакты з тэрарыстычнай групоўкай ЕТА, пасля забароны партыі неаднаразова спрабаваў стварыць новую палітычную фармацыю. Аднак суд у Мадрыдзе па іску пракуратуры кожны раз выносіў вердыкт — арганізацыю не рэгістраваць, паколькі яна — спроба аднавіць «Батасуну». Аднак, здаецца, цяпер нервы ў іспанскіх спецслужбаў здалі: яны арыштавалі Артэгі і яшчэ каля дзесяці актывістаў баскскага нацыяналістычнага руху, толькі за саму думку пра аднаўленне партыі. Па словах пракурора, зараз у колах, блізкіх да ЕТА, абмяркоўваецца такі праект, які збіраюцца даручыць Артэгі. Шмат хто палічыў такое абвінавачанне папросту апраўданнем рэпрэсій. У мінулую нядзелю на вуліцы Сан-Себасцьяна выйшлі прыкладна дзесяць тысяч маніфестантаў. Яны патрабавалі прыпыніць пераслед прыхільнікаў незалежнасці. Гэта самая вялікая дэманстрацыя ў рэгіёне за апошнія дзесяцігоддзе і моцны ўдар па іміджу ўраду сацыялістаў, які кіруе краінай з вясны мінулага года.

### ГІДА ВЕСТЭРВЕЛЕ



Старшыня нямецкай Партыі свабодных дэмакратаў (FDP) — адной з пераможцаў апошніх выбараў у Бундэстаг (14 працэнтаў) — ніколі не хаваў сваёй нетрадыцыйнай сексуальнай арыентацыі. Аднак зараз Свабодныя дэмакраты адмаўляюца ўносіць у тэкст Асноўнага закону папраўкі, якія забараняюць дыскрэдытацыю грамадзян з-за сексуальнай арыентацыі. Ініцыятарамі папраўак сталі лідэры ўрадаў трох зямель — Берліну, Брэмену і Гамбургу. Прычым у тыя ўрады так ці інакш уваходзяць амаль усе вядучыя партыі Германіі: сацыял-дэмакраты, кансерватары, Зялёныя, Левыя. Застаюцца яшчэ дзве ўплывовыя палітычныя сілы — баварскі Хрысціянскі сацыяльны саюз і згаданыя вышэй Свабодныя дэмакраты. Яны разам выступілі супраць змен у канстытуцыі. Калі з баварцамі ўсё зразумела (Баварыя лічыцца самым кансерватыўным рэгіёнам ФРГ), то забабоны лібералаў дасюль для ўсіх застаюцца сакрэтам. Пакуль галоўная версія — партыя Вестэрвеле вырашыла выкарыстаць тэму геяў і лесбіянак для ціску на хрысціянскіх дэмакратаў падчас цяперашніх перамоў аб стварэнні кабінету. Без згоды лібералаў ініцыятыва хрысціянскіх дэмакратаў і руžовых можа праваліцца, што адлюструецца на іх рэйтынгу.

▶ ВАНДРОЎКА

# НА ДНЕ ПАТОПУ

## ПАЭТЫКА АРМЯНСКАЙ ДРАМЫ



Фота Міхаіла Візеля

Ерэван рыхтуецца да Дня горада

Марыя МАРТЫСЕВІЧ

**Сонечная Арменія. Як толькі сонца вызірае з-за гор, разумееш: гэта не проста штамп, што свайго часу прыклеіўся да гэтай краіны дзякуючы савецкай рыторыцы, а канстатацыя факту. І чым больш глядзіш уверх, на чорна-зялёныя горныя хрыбты, яркае неба — тым больш разумееш: будзь ты Ноем, ты б таксама прышвартаваў свой каўчэг недзе тут. Але калі твой позірк слізгае па далёкім-далёкім схіле турэцкага з 1924 года Арарата ніжэй — следам за Ноем, што спускаўся тут на раўніну, каб пабачыць Вясёлку і пачаць Новае Жыццё, — табе падаецца, што ты дасягнуў самага дна патопу. Маленькі рудымент якога — велічнае возера Севан у вэлюме з шэрых аблокаў.**

### ДЗЕВЯНОСТЫЯ FOREVER

Мая Арменія вельмі і вельмі адрозніваецца ад Арменіі маіх бацькоў. Найперш таму, што для іх гэта шчасная, сонечная краіна з савецкага міфу з прыгожымі цёмнавокімі дзяўчатамі і хлопцамі ў густоўных нацыянальных строях, краіна лавашу ды інжыру. Маці была ў Арменіі ў маладосці і вывезла адтуль самыя цёплыя ўспаміны. Я ж да гэтай восені ў Арменіі ніколі не была, але так выйшла, што ў пэўныя часы армянскую мову чула ці не часцей за беларускую.

У вёсцы маёй бабулі ў пустым будынку саўгаснай адміністрацыі пасялілася сям'я ўцекачоў з Нагорнага Карабаху. Раз на тыдзень у бабульчыну хату прыходзіла захутаная ў чорнае жанчына, чакала тэлефанавання ад сваякоў і падоўгу эмацыйна размаўляла з кімсьці, горка пры гэтым плачучы. Гэта сям'я — іх пяцёра дзяцей, што гуляліся самі з сабой, бо не разумелі па-наску, іх маўклівы працавіты бацька, іх маці, што плакала ў слухаўку, — сталі для мяне гэткім жа сімвалам пачатку дзевяностых, як «снікерсы» ці талоны на харчаванне. Да таго ж для любога познеперабудовачнага дзіцяці Арменія асацыявалася найперш з Спітацкім землятрусам 1988 года — у адрозненне ад бліжэйшай нам аварыі на ЧАЭС, гэту трагедыю не замоўчвалі ў тэлевізары, а маштабы яе сапраўды шакавалі.

І вось цяпер, калі я трапіла сюды, усе тры вобразы Арменіі — біблейны, савецкі ды сучасны — перамяшаліся для мяне ў адзін стракаты візэрунак. Перада мной была старажытная прыгожая краіна лавашу, інжыра і такой постсавецкай разрухі, нібыта патоп з землятрусам адбыліся тут літаральна ўчора. Краіна кантрастаў — слаба сказана. Савецкія мікраараёны выглядаюць так, нібы дамы ўручную сабраныя іх жыхарамі са спадручных матэрыялаў, ніякай сістэмы ў забудове. І паміж гэтага бязладдзя сярод скалаў то тут то там высяцца шыкоўныя гатэлі ды рэстарацыі. А часам пасярод раўніны можна пабачыць раскошны, зіхоткі ўсходні палац з казак Шахеразады. Вам тут жа называюць імя ўладальніка гэтага палацу і пералічваюць усё, чым ён валодае ў Арменіі і па-за ёй.

Разам з тым, апроч як па працы (калі ў вас просяць міласціну, што, зрэшты, здараецца амаль штосекунды), армяне ніколі не скардзяцца і не плачуць.Назіраючы за людзьмі, з якімі сутыкаешся, ты амаль бачыш гэты працэс: армяне круцяцца.

### ЯК КРУЦЯЦЦА АРМЯНЕ

Армяне эмігруюць. Гэта нацыя са шматвекавой традыцыяй пакідання радзімы. Самая магутная хваля рассейвання армян па ўсім свеце была звязана з генацыдам армянскага народа ў 1877–1823 гадах у асманскай Турцыі. Толькі з 1915 па 1918 год туркі знішчылі паўтара мільёна армян. Гісторыкі называюць гэтыя зверствы «першым генацыдам XX стагоддзя», «рэпетыцыяй Халакосту». Менавіта таму большасць грамадзян Арменіі рашуча пратэставала супраць нядаўняга аднаўлення дыпламатычных стасункаў з Турцыяй. У апошнюю чвэрць стагоддзя насельніцтва краіны паменшала на тую ж лічбу.

Больш за паўтара мільёны армянаў выехала з краіны з 1975 года да нашых дзён. Падпольнае садзейніцтва эміграцыі — самы прыбытковы ценявы бізнес у Арменіі. Цяпер у краіне жыве 3 мільёны армянаў, у дыяспары — 9 мільёнаў. Ерэванскі аэрапорт Звартнац гудзе круглыя суткі. Гастарбайтэры, якія ляцяць на радзіму з Расіі ў перапоўненых самалётах «Аэрафлоту», з замілаваннем аглядаюць абрысы Звартнацу, амаль ідэнтычныя, дарэчы, абрысам аэрапорту «Мінск–2». 75 працэнтаў бюджэту краіны складаюць грошы, дасланыя дыяспарай.

Армяне сябруюць з Расіяй. Армянскай дзяржаве не выпадае чакаць не тое што падтрымкі — простай прыязнасці ад Грузіі, што сябруе з ЗША, ці хаўрусніка Турцыі Азербайджана, з якім цягам XX стагоддзя, нягледзячы і з перапынкам на Савецкі Саюз, армяне ваявалі за Нагорны Карабах. Расія традыцыйна падтрымлівала хрысціянскую Арменію ў яе спробах выжываць поруч з мусульманскімі суседзямі. Калі вы назіраеце адукаванага армяніна поруч з расіянінам, у гэты момант армянін хутчэй за ўсё прызнаецца расіяніну ў бязмежнай любові да вялікай рускай культуры. Пушкін, Талстой, Дастаеўскі, рускі балет… Зусім як нейкі русафіл-француз ці англічанін.

Істотная розніца паміж беларускім і армянскім інтэлектуаламі ў тым, што беларус выхаваны на расійскай культуры, якая амаль цалкам замяніла яму сваю, і пры гэтым пэўным чынам ад яе дыстанцуецца, спрабуе крытычна ставіцца да велікарускай спадчыны. Армянін — гадаванец магутнай культуры, якая — ён гэта цвёрда ведае — налічвае тысячу семсот год, з моманту прыняцця ў Арменіі хрысціянства ў 301 годзе. Армянскі алфавіт, ведае армянін, адзін з трох самых дасканалых у свеце. Армянская культура — старажытная і развітая, яе скарбніца — Матэнадаран, Інстытут старажытных рукапісаў, яе жамчужыны — старажытныя храмы і манастыры, яе спадчына — гэта і драматургія ды проза Уільяма Сараяна, які нарадзіўся ў ЗША, карціны мастака Аванэса (!) Айвазоўскага, якія займаюць ажно дзве залы ў Нацыянальнай карціннай галерэі ў Ерэване, песні Шарля Азнавур(ан)а, які нарадзіўся ў Францыі, музыкаў амерыканскага гурта «System of Down»… Армянін цвёрда праводзіць мяжу паміж сваім і рускім.

Разам з тым нават у Расіі я не бачыла на вуліцах такой колькасці людзей у спартовых касцюмах і футболках з надпісам «Russia». Рускія трыкалоры тут часта чапляюць на дамы і машыны поруч з армянскім трыкалорамі. Усё лагічна. Расія дае Арменіі хлеб.

Армяне запрашаюць гасцей. Калісьці каманда КВЗ «Новыя армяне» жартавала: «Мы, армяне, вельмі гасцінны народ. Калі да нас прыходзяць госці, мы ўжо ў вітальні прапануем ім тапачкі. У харошыя дні ўдаецца прадаць да 20 пар за вечар». Дык вось, гэты жарт спісаны з натуры! Жывучы ў гатэлі ў Ерэване госцю з Захаду даводзіцца плаціць за любы неасцярожны рух, які чамусьці абавязкова прыводзіць да пашкоджання маёмасці гатэля, за лішнюю ежу, прынесеную на стол, за тэлефонныя званкі з яго нумару ў час, калі яго ў гэтым нумары быць не магло… Майстэрства, з якім армяне вымагаюць з вас грошы за рэчы, бясплатныя ў любой іншай краіне, захапляе. І, самае цікавае, большасць турыстаў гэтыя грошы спакойна плаціць, не сярдуючы на па-ўсходняму мудрагелістыя хітрыкі. Як прыхаваную гуманітарную дапамогу армянскаму народу. 80 працэнтаў насельніцтва Арменіі жыве менш чым на 2 долары ў суткі. Намяняныя ў аэрапорце драмы таюць са страшнай хуткасцю. Але замежнікі не маркоцяцца — і набываюць яшчэ драмы па сумнеўным курсе, весела прыгаворваючы: «Няхай гэта будзе самай вялікай драмай у маім жыцці!» Драм — нацыянальная валюта Арменіі, якую самі армяне па-руску чамусьці вымаўляюць у жаночым родзе — «драма». Назва паходзіць ад грэцкага слова «драхма».

І, нарэшце, армяне робяць выдатны каньяк. Над Ерэванам дамінуюць два будынкі — кафедральны сабор Георгія-асветніка і каньячны завод «Арарат». І, мяркуючы па тым, як мужчыны дзесяці нацый, што прыехалі са мной на канферэнцыю, не згаворваючыся, у першы ж дзень шчыльнымі радамі ламануліся ў фірмовую крамку пры другім будынку, менавіта яго яны палічылі за асноўны духоўны цэнтр Арменіі.

### ВЫНАХОДНІКІ САЎКА

За тыдзень у Арменіі я ўбачыла значна больш перагукаў з беларускай рэчаіснасцю, чым мне таго хацелася б. Так, у Беларусі — чыста, у Арменіі — брудна. Беларускія мільянеры шыфруюцца, армянскія выстаўляюць багацце напаказ. Беларусь сціснулася ў суверэнны камячок, сварачыся то з Расіяй, то з Захадам, Арменія — найперш праз сацыяльна актыўную дыяспару — адкрытая як Расіі, так і астатняму свету (па-за сумным выключэннем Турцыі ды Азербайджану).

Але вось Свята перакладчыка ў Ашакане, дзе пахаваны армянскі першаасветнік пятага стагоддзя, перакладчык Бібліі Месроп Маштоц. Прамову трымае святар армянскай апостальскай царквы. Пасля прамовы залу напаўняюць воплескі такога тэмбру і інтэнсіўнасці, што мяне аж перасмыкае. Недзе я ўжо гэта чула… І раптам я з жахам разумею: гэтае «недзе» — хронікі сталінскіх часоў. Ерэван, у якім амаль не засталося старажытных будынкаў, квітнее тым, што мы ў Беларусі называем «сталінскім ампірам».

Калі я ўпершыню трапіла на Цьвярскі бульвар у Маскве (мне было 18 гадоў), я ледзь не заплакала: зразумела, што Мінск — копія Масквы, толькі цацачная. Калі я трапіла па плошчу Рэспублікі ў Ерэване, мне захацелася смяяцца. У адрозненне ад Мінску, дзе сталінскі ампір падмяў пад сябе віленскае барока ды рускі мадэрн, Ерэван «па-сталінску» выглядае абсалютна арганічна. Гэта манументальнае паўтарэнне традыцыйнай армянскай архітэктуры… І гэта не ў Арменіі не выветрыўся савок. Гэта Сталін і іншыя каўказцы пры ўладзе ў свой час закруцілі ўвесь СССР па сваёй мадэлі. І Мінск затачаны пад густы таталітарнага кіраўніцтва, якое ў 1930-я гады прыйшло з усходу.

Тычыцца гэта не толькі горадабудаўніцтва, але культуры ўвогуле. Такая структура, як Саюз пісьменнікаў, з яго строгай іерархіяй ды абавязковай вернасцю правячай ідэалогіі — чыста азіяцкая прыдумка. Сузіраючы гіганцкія манументы дзеячаў армянскай культуры, да болю падобныя на помнікі Купалу ды Коласу ў Мінску, на прасторныя плошчы Ерэвана, засаджаныя геаметрычна правільнымі клумбамі, я вельмі зайздросціла існінна заходнім гасцям Арменіі. Для іх такое — сапраўды экзотыка. Для мяне гэта — крыху зашмальцаваная аўтэнтычная мадэль, паводле якой дагэтуль дбайна і няспынна выбудоўваецца знешні выгляд маёй краіны, хоць Іосіф Джугашвілі ўжо паўстагоддзя як чыста фізічна нязводна насаджваць сваю эстэтыку на адной шостай частцы сушы.

### ГРАНАТЫ ТОЙ СІСТЭМЫ

Сімвал Арменіі — гранат. На сувенірных латках прадаюць магнікі на лядоўню ў форме гэтага фрукта. Кошты еўрапейскія — 3–5 еўра (1,5–2,5 тысячы драмаў). Дома ты вешаеш магнікі на лядоўню і выяўляецца, што фрукт быў сапраўдны, толькі высушаны — магнічкі ляскаецца на падлогу, і гранат крышыцца на зернейкі. Але гэта ўжо не здзіўляе цябе і не псуе настрою: смачнае гранатавае віно, цудам правезенае праз беларускую мытню, не апынулася гранатавым сокам.

Пры тым, што з-пад ног у цябе вылузвае раскрышаная савецкая тратуарная плітка, а праз пяць хвілін цябе зноў незаўважна кінуць на пару баксаў, у Арменіі ты не дэпрэсуеш. Мабыць таму, што тут сонечна. І пры ўсёй разрусе і бедаце, што атачаюць цябе, ты адчуваеш у Арменіі магутны патэнцыял. Бо, поруч з «Расіяй», ты сустракаеш на вопратцы армянскіх хлопцаў і іншыя тапонімы, напрыклад, «Дубай». Выглядае на тое, што гэты ўсходні аазіс бізнесу — новая мадэль для Арменіі. Краіна заўважна будуецца, і аднойчы расквітнее напоўніцу. Проста пасля патопу павінна мінуць яшчэ крышачку часу.

МУЗЫКА

# ДАЛЯГЛЯДЫ СПАДАРЫНІ АРЫНЫ

Анатоль МЯЛЬГУЙ










**Бадай, адной з самых вялікіх праблем сённяшняга этапу развіцця айчыннага музычнага рынку з'яўляецца недастатковая колькасць прадзюсераў, якія б генерыравалі свае ідэі і ўкладалі сродкі ў рэалізацыю арыгінальных праектаў. А калі ідзе размова пра нацыянальна арыентаваныя прадзюсерскія сілы, то ўвогуле трэба казаць пра кадравы недахоп.**

Але ўслед за прыкладам знакамітага «рухавіка» сучаснай беларускай музычнай культуры, кіраўніка лэйбла БМАgroup Віталя Супрановіча, да справы выдання нацыянальных музычных праектаў далучаюцца ўсё больш і больш зацікаўленых асобаў, які здабываюць такі неабходны выдавецкі вопыт, шукаючь «залатую сярэдзіну» паміж мастацкай вартасцю сваіх рэлізаў і камерцыйным попытам на іх.

Адным з такіх выдаўцоў-прадзюсераў, які сваімі праектамі ўзбагачае сучасную беларускую музычную культуру, можна назваць Арыну Вележ, якая дэбютавала ў якасці прадзюсера ў 2001 годзе супольным з БМАgroup агульнабеларускім музычным праектам «Легенды Вялікага Княства». Праект быў задуманы і рэалізаваны як цалкам еўрапейскі і па свайму рэпертуару, і па вонкаваму афармленню ў выглядзе дыгіпака-складанкі. Высокую якасць выдання адзначылі беларускія і замежныя музычныя аглядальнікі, а таксама шматлікія слухачы, якія набылі унікальнае выданне. Поспех «Легендаў» спарадзіў працяг праекта: Арына завяршыла складаную прадзюсерскую працу, і яе намаганнямі быў падрыхтаваны дыск «Старажытная Зямля. Гістарычная музыка Беларусі», які зноў жа пабачыў свет на БМАgroup. Рэалізацыя гэтых арыгінальных праектаў высунула Арыну Вележ у лік найбольш аўтарытэтных незалежных прадзюсераў Беларусі.

Апошнім часам творчая скарбонка Арыны папоўнілася новымі выданнямі. Гэтыя дыскі і іх праграмы часцяком называюць супярэчнымі, але пры больш дасканальным разглядзе ўпэўніваешся — мы маем справу з новым крокам у справе захавання і адраджэння нацыянальнай культуры.

## Музыка сядзіб і палацаў

Упэўнены, што цікавасць да дыска «Medieval. Музыка сярэднявечных фэстаў» будзе забяспечана тым, што прадзюсер адабрала для яго праграмы трэкі медыевальных гуртоў, якія ў большасці не маюць сваіх сольных дыскаў. На жаль, многія з іх, як заўважае Арына, недастаткова надаюць увагу беларускаму па паходжанню рэпертуару, а засяроджаны на еўрапейскай музыцы. Гэтыя творы, што, верагодна, гучалі і на тэрыторыі Беларусі, цяпер аб'яднаныя пад адной вокладкай. Гурты, якія прадстаўлены на гэтым дыску, дарэчы, датаваным 2008 годам, — актыўныя ўдзельнікі фэстаў сярэднявечнай музыкі («Лошыцкі фэст», «Старажытная зямля»), завадатарам якіх да сённяшняга часу з'яўляецца спадарыня Арына. А ўсё пачалося з захаплення айчыннай гісторыяй, гісторыяй рыцарства ў Беларусі. Шмат часу і энергіі Арына Вележ аддае арганізацыйнай працы моладзевага клуба «Рыцары Вялікага княства», удзельнікі якога адраджаюць рыцарскія традыцыі ВКЛ. Гэта зацікаўленасць заўсёды ішла паралельна з вывучэннем айчыннай музычнай спадчыны, з крокамі па яе адраджэнню і папулярызацыі, спачатку ў асяроддзі музыкантаў, а пасля і сярод слухачоў.

Вынікам гэтай працы, у тым ліку і спадарыні Арыны Вележ, стала трывалая тэндэнцыя, калі беларускія выканаўцы і гурты старажытнай музыкі пачалі шукаць сваю творчую тоеснасць у айчынным культурным кантэксце. Напрыклад, у рэпертуары гурта сярэднявечнай музыкі «Lituus» (Баранавічы) большасць п'ес — айчыннага паходжання («Полацкі сшытак», «Віленскі сшытак»). Але ў баранавіцкіх музыкаў ёсць і музычныя творы заходнееўрапейскіх аўтараў мінулага, якія з поспехам выконваюцца на айчынных і замежных музычных фэстах. І не звяртаць увагу на гэту частку творчасці гурта «Lituus», як іншых медыевальных выканаўцаў, было б несправядліва. Бо мы, беларусы, не без падстаў лічым сябе часткай еўрапейскага культурнага мацерыка!

Гэты пасыл прадзюсера Арыны Вележ і падкрэслівае альбом «Medieval. Музыка сярэднявечных фэстаў». Мо таму так яскрава гучаць творы ад іншых выканаўцаў, якія прадстаўлены на дыску. Увагу слухачоў, безумоўна, прыцягне выканаўчы прафесіяналізм удзельнікаў гурта «Brevis», якімі кіруе Павел Сурагін, узрушыць гучанне еўрапейскіх танцавальных рытмаў пад беларускую дуду ў цудоўным выкананні Юрася Панкевіча і яго капэлы «Testamentum Terrae», зачаруе ірландскі меладызм, які спавядае гурт «Ceilidh Ceol» і яго заснавальнік Алесь Чумакоў.

Да таго ж, праца Вележ упершыню знаёміць з таленавітымі выканаўцамі старажытных мелодый, якія яшчэ не паспелі выдаць свае дыскі. Думаю, слухачам цікавым падасца гурт «Ліцвінскі хмель», творчасць якога вельмі горача прымаюць наведвальнікі медыевальных фэстаў. Гэта тычыцца, напрыклад, такой знакамітай шведскай песні, як «Herr Mannelig» у арыгінальнай апрацоўцы музыкантаў «Ліцвінскага хмелю» з жаночым вакалам. Дарэчы, гэта кампазіцыя дае падставы для параўнанняў: тая ж старажытная мелодыя натхніла і беларускіх рок-музыкаў з гурта «LitvinTroll». Вось чаму дыск «Medieval. Музыка сярэднявечных фэстаў» стане жаданым папаўненнем айчыннай медыевальнай фанатэкі, а таксама зборам аматараў старажытных мелодый у арыгінальных апрацоўках...

## Сялянская папса

Чарговы дыск прадзюсера — «Вясковая лірыка. Рамансы, дрындушкі» выклікаў даволі гарачую дыскусію пра мэтазгоднасць такіх спрэчных праектаў. Чаму так адбылося? Таму, што Арына Вележ вырашыла прадставіць узоры сучаснага «фальклору», які часцяком нараджаецца пад уздзеяннем сродкаў масавай інфармацыі суседняй краіны, русіфікацыі беларускай вёскі з суцэльным дамінаваннем «трасянкі». Па сутнасці, на дыску з цудоўнай назвай «Вясковая лірыка» хаваецца зборнік сучаснага кіча, які не мае амаль нічога агульнага з сапраўдным фальклорам. Кшталту такіх «шэдэўраў»:

*Слышу шагі там раздаюцца,*
*Наверна мілый мой ідёт.*
*Но он совсем другую, другую*
*Девушку ведет...*

*Возьму наган*
*У свае я рукі.*
*Пайду ў садочак я гуляць.*
*А там в зялёненькам садочку*
*закончу сваю я любоў.*

Крытыкі гэтага праекта адзначаюць, што па-сутнасці, такая «народная творчасць» забівае спеўную душу народа, стварае падставы для падмены фальклору з яго паэтыкай і сакральнасцю квазі-варыянтам, які ўжо стаў візітоўкай «Дажынак» і «Славянскага базару» («...у Беларусі знайшліся руплііўцы, каб пільна захаваць засмарканыя парцінкі нашых першых акупантаў-перасяленцаў». В. Мартыненка, http://belmusic.org).

Але Арына бярэ на сябе адказнасць і выдае зборнік беларускага фолк-кіча. Бо лічыць, што і гэты напрамак псеўдамастацтва парадаксальна адлюстроўвае тыя складаныя культурныя і моўныя працэсы, якія адбываюцца на вёсцы. Яны маюць негатыўную афарбоўку, але не заўсёды. Вось спробу адшукаць пазітыўныя тэндэнцыі ў гэтым працэсе ставіць за мэту А. Вележ. Напрыклад, частку музычнай праграмы «Вясковая лірыка» складаюць інструментальныя п'есы ў выкананні простых вясковых музыкаў. Упэўнены, «Падыспань», «Вальсок» альбо «Танга» з «Полькай» дадуць айчынным фолк- і медыевальным выканаўцам шмат падстаў для разваг наконт таго, як павінен гучаць сапраўды беларускі музычны гурт, што ёсць сапраўднае беларускае гучанне.

Да таго ж, сярод гэтай падборкі кіча ёсць сапраўдныя «хіты», якія, нягледзячы на наша непрыняцце «трасянкі» і псеўда-фолку, выклічуць едкі смех. Вось, напрыклад, пра што распавядаецца ў «Жорсткім рамансе»:

*Аднажды была гімназістка, я с ней в Ленінграде был знаком.*

*Патом она стала данцісткай, імела врачебный дiплом...*

Далей ідзе традыцыйны распавед пра «няшчасную любоў», «ізмену» і тое, што «аднажды ў сырую пагоду я зубы свае застудзіў». І вось — выратавальны візіт да дантыста, да былой каханкі, якая мае свае планы на помсту:

*А жэншчына-ўрач маладая скруціла мне рукі назад.*

*Чатыры здаровыя зубы ўсе вырвала Надзя падрад.*

*В тазу мае зубы ляжалі, а я, как рабёнак, рыдаў,*

*А жэншчына-ўрач хахатала, па голасу Надзю ўзнаў.*

*— Уйдзі ж з майго кабінэта, бяры свае зубы ў карман,*

*Насі свае зубы ў карманах і помні з данцісткай раман.*

І такіх «шэдэўраў» дастаткова, каб асэнсаваць тое, што робіцца з сучасным беларускім фальклорам. І зрабіць нешта для яго захавання і папулярызацыі. Нават такімі сродкамі, якімі гэтага робяць некаторыя беларускія фолк-выканаўцы. Маю на ўвазе гурт «Джамбібум», удзельнікі якога зрабілі сваю сатырычную апрацоўку песні «Кіпарысы», што прадстаўлена на дыску. Вось яшчэ адзін станоўчы вынік спрэчнага рэлізу: мы смяёмся (хоць іншы раз хочацца плакаць!), значыць — існуём.

## Ад родных ніў

Лагічна, што пасля «Вясковай лірыкі» спадарыня Арына вырашыла засяродзіцца на ўзорах сапраўднай народнай музыкі і тым самым паўтарыць поспех і ўклад у скарбонку нацыянальнай культуры праектаў «Легенды Вялікага Княства» і «Старажытная Зямля». Такім крокам стала выданне новай фолк-энцыклапеды «Спевы Беларусі», якую Арына ажыццявіла ў супрацы з вядомым спецыялістам-фалькларыстам Тацянай Песнякевіч. Іх намаганнямі быў выдадзены зборнік аўтэнтычнага беларускага фальклору розных рэгіёнаў нашай краіны, запісы якога былі зроблены на працягу апошніх сарака гадоў. На дыску прадстаўлена ўся тэматычная разнастайнасць нацыянальнага фальклору: вясельныя спевы, калядкі, купальскія і веснавыя і побытавыя песні.

І тут зацікаўлены слухач заўважыць тыя каласальныя адрозненні, якія ляжаць паміж псеўдафальклорам «Вясковай лірыкі» і глыбіннымі нацыянальнымі каранямі мелодыкі «Спеваў Беларусі». Гэтую прорву адразу ж адчуеш, калі ўслухаешся ў такія народныя шэдэўры, як купальская песня «Яна Купала» з яе старажытным таямнічым сэнсам і традыцыйным шматгалосным распевам. Гэта гучаць запісы спеваў гурта з вёскі Раеўшчына Маладзечанскага раёна Мінскай вобласці.

Традыцыйна такія праекты ўключаюць і інструментальныя нумары. Гэта стымул для айчынных фолк- і фолк-мадэрн-выканаўцаў шукаць новыя адценні ансамблевага гуку, больш ярка і чыста выкарыстоўваць магчымасці народных інструментаў, а таксама шляхі іх гарманізацыі ў гурце. Упэўнены, што маладыя музыкі, якія вырашаць, што яны ўсё ведаюць пра асаблівасці нацыянальнага выканання, шмат чаго змогуць узяць, напрыклад, ад музыкаў гурта вёскі Старое Сяло Магілёўскай вобласці, якія з агеньчыкам выконваюць на дыску знакамітую «Лявоніху», або ад мелодый «Мазуркі» і «Кадрылі» ў выкананні «чалавека-аркестра» Станіслава Маленчыка, які прыцягвае ўвагу слухачоў сваёй віртуознасцю і універсальнасцю. І такія пачуцці ад сустрэчы з сапраўдным мастацтвам узрастаюць ад песні да песні, ад трэка да трэка дыска «Спевы Беларусі»!

Шкада, што такія цудоўныя па сэнсу праекты часам суправаджаюцца не вельмі якасным афармленнем. Пра гэта прыходзіцца ўзгадваць, бо надпісы назваў трэкаў і выканаўцаў на «Спевах Беларусі», нават пры добрым зроку, чытаюцца вельмі цяжка. А гэты недахоп псуе добрае ўражанне ад усяго альбома.

▸ **ВЫСТАВЫ**

# ВОСЕНЬСКІЯ ІМПРЭЗЫ НАЦЫЯНАЛЬНАГА МАСТАЦКАГА

Аляксей ХАДЫКА

**Ці варта нагадваць, што Нацыянальны мастацкі музей — галоўная мастацкая ўстанова краіны, якая ў свой юбілейны 70-ы год з вартай пашаны настойлівасцю працягвае прывабліваць неабыякавых да прыгожага людзей у свае залы? А за ўменнем быць прыцягальнымі стаіць штодзённая праца вялікага калектыву. Апошнія месяцы прынеслі шэраг навін з гэтай паважанай інстытуцыі, і не ўсе яны звязаныя з экспазіцыйнай работай.**



Напалеон Орда (1807–1883). Замак у Біржах



Замак у Біржах. Сучасны выгляд

Так, у верасні пры падтрымцы пасольства РБ у Літоўскай Рэспубліцы і Фінляндскай Рэспубліцы адбыўся візіт дэлегацыі Нацыянальнага мастацкага ў музей Біржайскага краю Літвы «Сэла». У выніку дырэктарамі абедзвюх устаноў Уладзімірам Пракапцовым і Гінтарасам Буткявічусам было падпісана пагадненне пра супрацоўніцтва ў мэтах развіцця сувязяў паміж музеямі і садзейнічанні культурнаму абмену паміж дзвюма краінамі.

Музей «Сэла» размяшчаецца ў былой рэзідэнцыі біржайскіх Радзівілаў, збудаванай у 1580-я гады Крыштофам Радзівілам, ён адноўлены пасля шведскага наезду 1625 года пад уплывам галандскай сістэмы бастыённых замкаў у рэнесанснай стылістыцы. Комплекс доўгі час быў цэнтрам мецэнацтва і высокай культуры, зберагаў значныя калекцыі, але, на жаль, не перажыў катаклізмаў Паўночнай вайны і быў зруйнаваны ў 1704 годзе шведамі.

У 1978–1985 гадах частка замкавага комплексу паўстала з руін, а ў адноўленыя карпусы пераехаў музей Біржайскага краю, заснаваны яшчэ ў 1928 годзе. Яго багацце — 100 тысяч экспанатаў: нумізматыка, пячаткі, кафля, кераміка і шкло яшчэ радзівілаўскіх часоў, значная доля калекцый Тышкевічаў, якія валодалі мястэчкам пасля Радзівілаў (з 1794 года). Гэта дазволіла ўпрыгожыць інтэр'еры аўтэнтычнымі гістарычнымі партрэтамі, мэбляй, прадметамі побыту.

Дарэчы, і мінскаму музею ёсць што прапанаваць для часовага экспанавання ў Біржы: партрэты «князёў на Біржах і Дубінках» Юрыя (1480–1541), Крыштофа (1585–1640) і Януша Радзівілаў (1612–1655) знаходзяцца ў экспазіцыі НММ. Але яшчэ важней той практычны досвед, якім літоўскія калегі могуць падзяліцца з беларусамі: зараз распрацоўваецца канцэпцыя музеефікацыі інтэр'ераў Мірскага замка.

Вернемся ў Мінск. У залах мастацкага музея таксама адбылася прыемная перамена: анфілада з трох пакояў першага паверха старога корпуса прыняла творы беларускага мастацтва XIX — пачатку XX стагоддзяў. Прыхільнікаў вытачаных нацюрмортаў і партрэтаў «пецярбургскага» акадэміка Івана Хруцкага, паэтычна-задуменных краявідаў Апалінарыя Гараўскага, каларызму работ Станіслава Жукоўскага і моцнага пэндзля Фердынанда Рушчыца заклікаем у залы, каб пабачыць і знаёмыя, і раней не экспанаваныя творы. З 500 твораў калекцыі адпаведнага перыяду музейшчыкам было што абраць для працягу аповеду пра беларускае мастацтва.



Парыс Бардоне. «Мадонна з дзіцяткам, Святымі Энрыка з Уппсалы і Антоніем Падуанскім». Каля сярэдзіны XVI ст.



Ян Чадзякоўскі (1885–1969). Партрэт невядомай. 1910-я. З выставы польскага мастацтва ў НММ

Да прэзентацыі чарговай навіны з музея дазвольце колькі лірычных фраз. Яны падкрэсляць неабыякавасць стаўлення да прапанаванага там невялікага экспазіцыйнага эксперымента. Калі восеньскія шэрыя хмары пачынаюць захутваць нізкае неба — хочацца адчуць подых цеплыні і святла. Прыгадаць яскравыя імгненні спелага лета. А такім летам у еўрапейскай культуры было мастацтва італьянскага Адраджэння і маньерызму. Парыс Бардоне (1500–1570), чыя карціна «Мадонна з дзіцяткам, Святымі Энрыка з Уппсалы і Антоніем Падуанскім» завітала на выставу аднаго твора ў Нацыянальны мастацкі музей.

Бардоне адносіцца да ліку тых шчаслівых творцаў, чые працы сабралі ўраджай двух стагоддзяў узвышанага палёту мастацкіх муз над прыгожай паўднёвай краінай. Дарэчы ўзгадаць пра гадзінныя чэргі захопленых гледачоў, што выстройваліся ў 1974 годзе каля маскоўскага Пушкінскага музея замежнага мастацтва, калі ў СССР на падобную выставу «аднаго твора» прывезлі славутую Джаконду Леанарда. Твору Бардоне не хапае сусветнай вядомасці хрэстаматыйных шэдэўраў, але гэта тое мастацкае палатно, якое варта бачыць.

Каларызм венецыянскай школы, засвоены Бардоне ў майстэрні Тыцыяна, захапленне ім узнёслацю стылістыкі Джарджоне, зрабіла яго майстрам з сусветным прызнаннем. Не выпадкова ў 1538 годзе ён атрымаў запрашэнне вытанчанага знаўцы культуры французскага караля Францыска I для ўпрыгажэння партрэтамі каралеўскай сям'і і прыдворных яго замка ў Фантэнбло. Апрача Венецыі і Фантэнбло, творчы лёс накіроўваў мастака ў Аўгсбург, а таксама італьянскія гарады, сярод якіх Мілан, дзе ён мог пазнаёміцца з сям'ёй Танцы, заказчыкамі прывезенага ў Мінск твора.

Першасна жывапіснае палатно знаходзілася ў выкупленай Габрыэлем і Галеаца Танцы ў 1536 годзе капліцы Божага цела катэдры ў Бары, куды бліжэй да сярэдзіны стагоддзя яны заказалі карціну, прысвечаную памяці іх дзеда Энрыка. Энрыка Танцы, консул міланскай грамады ў Бары, пераехаў у гэты горад з Мілана, верагодна, следам за дваром Ізабелы Арагонскай, маці Боны Сфорца. Тут і пачынаецца сувязь «Мадонны з дзіцяткам, Святымі Энрыка з Уппсалы і Антоніем Падуанскім» з эпізодам беларускай гісторыі: твор быў змешчаны ў катэдру амаль адначасова з труной з целам ураджэнкі Мілана, польскай каралевы і вялікай літоўскай княгіні Боны Сфорца, якая была бязлітасна атручана сваім сакратаром Джан Ларэнца Паппакодэ.

На палатне, якое паслужыла помнікам, не такія звыклыя для творчасці Бардоне сакавітыя, усмешлівыя жаночыя вобразы, за яскравы тыпаж часам званыя «куртызанкамі», вялікім майстрам якіх ён быў, але — задуменная Марыя, засяроджаныя святыя абапал. Твор, які трапіў у Мінск дзякуючы дапамозе італьянскай амбасады, — адна з вяршынь духоўнай прыгажосці і спелага майстэрства ў спадчыне Бардоне.

Яшчэ навіна з Мастацкага музея — адчыненая з 9 кастрычніка па 2 лістапада камерная выстава «Польскае мастацтва другой паловы XVIII — першай паловы XX стагоддзяў». Сталыя наведвальнікі музея па старой экспазіцыі памятаюць хіба манументальны «Пейзаж з млыном» Юзафа Рапацкага (1871–1929), а сярод сабраных у невялікай зале першага паверха твораў жывапісу, графікі і пластыкі можна спаткаць цікавыя рарытэты. Такія, як праацаваны эскіз кампазіцыі «Звеставання» Шымана Чаховіча (1689–1775), выхаванца рымскай акадэміі св. Лукі, настаўніка Францішка Смуглевіча. Эпігон познебарочнага стылю, але вельмі майстравіты і працаздольны, Чаховіч упрыгожыў сваімі палотнамі калегіум езуітаў і касцёл св. Стэфана ў Полацку — на жаль, яны загінулі. Уладзіслаў Сыракомля вельмі высока ацэньваў творы Чаховіча ў мінскіх касцёлах, таксама не захаваныя. Вось жа рэдкі выпадак убачыць арыгінальную работу мастака. А побач — скульптурны медальён самога Сыракомлі работы Даніэля Залескага (1827–1868). А ці не цікава ўбачыць партрэт 1920-х гадоў апошняй уладальніцы Нясвіжа княгіні Вольгі Радзівіл (1886–1948), жонкі Лявона Уладзіслава Радзівіла. Ці акварэлі Юльяна Фалата (1853–1929), ілюстратара княжацкіх паляванняў пад тым жа Нясвіжам?

Зычым нашым чытачам не прамінуць магчымасць убачыць плён выставачнай працы калектыву НММ, а музею пажадаем і надалей радаваць беларускую сталіцу ўдумліва падабранымі каштоўнасцямі са сваіх збораў і гасцявымі выставамі.

Новы Час
Масава-палітычная газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар
Аляксей Кароль

Пасведчанне аб рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.
**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.
**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў».

Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.
**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220012, г. Мінск, зав. Інструментальны, 6-214.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 280 17 91.
novychas@gmail.com; www.novychas.org
**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова №
Падпісана да друку 23.10.2009. 8.00.
Наклад 5050 асобнікаў. Кошт свабодны.
Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы.
Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.